незалежная газета

№ 45 (643) 2 снежня 2009 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Краўчанка — кандыдат у прэзідэнты: плюсы і мінусы**

Старонка 3



**Полацкая святыня ўпрыгожыць падмаскоўны пасёлак мільянераў**

Старонка 12

**Як нас праслухоўваюць**



Старонка 15

## У НУМАРЫ

**Забралі ў бізнэсоўца і рынкі, і крамы**

Полацкі магнат Захараў асуджаны на 2,5 года з канфіскацыяй маёмасці. **Старонка 5.**

**КДБ змагаецца са «шкодным кірункам думак» асобных беларускіх грамадзян**

З такім прызнаннем выступіў начальнік УКДБ па Брэсцкай вобласці палкоўнік Леанід Дзядкоў. **Старонка 5.**

**Тэракт ці звыклае расійскае раздзяўбайства?**

Масква і Пецярбург у жалобе пасля аварыі «Неўскага экспрэса». **Старонка 6.**

**Іх рэцэпт шчасця**

Яраш збіраўся застацца ў Францыі. Але адчуў такі прыступ тугі, што вырашыў вярнуцца. Можа, прадчуваў сустрэчу з Аксанай? А ў Аксаны не заладзіўся першы шлюб. Сустрэліся Аксана і Яраш на мітынгу ў 2006 годзе... Пра адну беларускую сям'ю піша Наталка Бабіна. **Старонка 10.**

**Тамара Лісіцкая гатовая**

перакладаць уласныя кнігі. **Старонка 12.**

# Ударыўся галавой у бардзюр між райаддзеламі міліцыі і КДБ

Забойства ці здарэнне? У Мар'інай Горцы загінуў распаўсюднік незалежнай прэсы. **Старонка 8.**



Юлія Дарашкевіч

**Непрытомнага Валянціна Доўнара знайшлі каля гэтых кустоў. Калі верыць міліцыі, ён праляжаў тут некалькі гадзін. Будынак на заднім плане — Пухавіцкі РАУС.**

## Які сігнал, такі і адказ



Першым заходнім лідэрам, які наведаў Беларусь пры Лукашэнку, стаў скандальны Берлусконі. Еўропа не пэўная ў шчырасці Мінска. **Старонка 3.**

# Мутны мытны саюз

Расія, Беларусь і Казахстан узгаднілі адзіны мытны тарыф, але не стварылі адзінай мытнай прасторы.

27 лістапада ў Мінск прыязджалі Мядзведзеў і Назарбаеў. Разам з Лукашэнкам яны падпісалі дамову аб стварэнні Мытнага саюза. Ён быў задуманы як чарговы крок глабальнай эканамічнай інтэграцыі краін. Аднак размовы аб наступным кроку — стварэнні адзінай мытнай прасторы — адкладзеныя да лепшых часоў. Паводле інфармацыі агенцтва «Прайм-ТАСС», вырашаць гэтае пытанне прэзідэнты ў Мінску нават і не збіраліся. Пагаднення наконт гэтага рашэння не было ў пакеце дакументаў на падпісанне. Згода наконт тэрмінаў стварэння супольнай мытнай тэрыторыі дасягнута не была.

Расію цалкам задавальняе тая сітуацыя, якая з'явіцца з 1 студзеня, і ёй будзе даволі выгадна замарозіць развіццё Мытнага саюза на гэтым этапе. Адзіны мытны тарыф дазволіць расіянам зрабіць свае тавары канкурэнтаздольнымі на рынках Беларусі і Казахстана. А вось мытная прастора можа прывесці да таго, што праз неабароненыя казахскія межы Расію заваляць кітайскія тавары.

Што дрэнна Расіі — добра Беларусі. Такога меркавання, відаць, прытрымліваецца Лукашэнка, заяўляючы пра мытную прастору як пра відавочны плюс для беларускай эканомікі. «Мытны саюз — больш надзея на будучы эфект у эканоміцы, чым поспех цяпер. Вось адзіная эканамічная прастора — гэта будзе поспех», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

**Працяг на старонцы 4.**

**Лукашэнка: «Нічога страшнага, калі мы сюды будзем завозіць менш хламу [легкавых аўтамабіляў] з Еўропы»**

«Мытны саюз — гэта ўзаемныя ўступкі, узаемная падтрымка і вялікі рынак», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Баяцца тут няма чаго». **Старонка 4.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі старонку 2.

## Лідэр КХП-БНФ не можа атрымаць ордэн «За заслугі перад Польшчай»

Бо на гэта трэба дазвол Лукашэнкі.

Прэзідэнт Польшчы Лех Качынскі ўзнагародзіў ордэнамі «За заслугі перад Польшчай» розных ступеняў прадстаўнікоў дысідэнцкага руху краін былога Савецкага Саюза. Сярод узнагароджаных былі грамадзяне Украіны, Літвы, Эстоніі, Грузіі. Усе яны падтрымлівалі сяброўскія адносіны з польскай «Змагарнай Салідарнасцю» ў 1980-я.




Мусіў атрымаць узнагароду таксама адзін з лідэраў Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ Валеры Буйвал. Ён прысутнічаў у Варшаве, але ордэн так і не атрымаў. Паводле польскага пратакола, для ўзнагароджання трэба згода кіраўніцтва краіны, дзе жыве лаўрэат. Пакуль дазволу ад Лукашэнкі няма.

Сам спадар Буйвал адмаўляецца каментаваць гэтыя падзеі: «Падзея яшчэ не адбылася. Чаму не адбылася? Тут лепш звярнуцца ўласна да палякаў», — кажа В.Буйвал.

У падобнай сітуацыі апынуўся і расійскі праваабаронца Аляксандр Падрабінек. Ласкі ад Мядзведзева ён таксама не дачакаўся. У сваім блогу Падрабінек прыняў рашэнне адмовіцца ад узнагароды, калі для яе атрымання патрэбная згода «дыктатараў і нелегітымных прэзідэнтаў іншых краін».

**Зміцер Панкавец**

# Раман Марціновіча забаранілі прадаваць на кірмашы

Кніга журналіста Віктара Марціновіча «Параноя» трапіла ў чорны спіс.

«Усё ўжо. Не будзе гэтай кнігі ў нас. Забаранілі. І не пытайцеся яе нават. Ніхто вам нічога не скажа», — такі вынік мела спроба журналіста «НН» набыць раман Віктара Марціновіча «Параноя» на кірмашы «Свет кніг», што ў «Белэкспа». Сяргей Кірпетаў — асоба, адказная за кніжны кірмаш у «Белэкспа», на запыт аб праўдзівасці словаў гандляра адказаў толькі, што «ўяўлення аб гэтым не мае».

Трохі іншай была рэакцыя ў мінскіх кнігарнях.

«Няма ў нас гэтай кнігі. Была, а цяпер няма. Невядома, ці будзе. Вазьміце на касе візітоўку і тэлефануйце нам», — параіла адміністратарка «Цэнтральнай кнігарні».

Аб немагчымасці набыць кнігу «НН» паведаміла чытачка Вольга Шпарага: «На кірмашы спрабавалі пытацца ў суботу. На тым, што на Янкі Купалы знаходзіцца. Адны гандляры казалі, што не чулі пра яе, іншыя адварочваліся. Толькі адзін сказаў, што ўчора ўлады забаранілі прадаваць у Беларусі».

Гандляры кнігамі на ўмовах ананімнасці гавораць, што падобныя забароны распаўсюду выдаюцца адміністрацыяй неафіцыйна. Не існуе нейкіх дакументаў альбо распараджэнняў на гэты конт. Адміністрацыя проста паведамляе аб непажаданасці продажаў той ці іншай кнігі. Для гандляроў усё адразу становіцца зразумела. Ніхто не хоча мець праблем з адміністрацыяй.

На асноўным беларускім партале oz.by кніга знаходзіцца ў спісе бестсэлераў, яе абяцаюць даставіць замоўніку за 8-14 дзён — стандартны адцінак часу для любой кнігі на партале.

**Алесь Пілецкі**

**Напаўзабароненая кніга ўвайшла ў спіс бестсэлераў на сайце oz.by.**




**Раман «Параноя»**

распавядае аб краіне, падобнай да Беларусі, і горадзе, падобным да Мінска. Ёсць там і пра дыктатуру, і пра чалавечыя адносіны. Шмат хто знайшоў у кнізе Марціновіча падабенства з оруэлаўскім «1984».

### СЦІСЛА

**У першыя дні зімы — да плюс 12**

2—3 снежня ў Беларусі пройдуць дажджы, апусцяцца туманы. Тэмпература ноччу плюс 2—9°С, днём плюс 6—12°С. Цяпло захаваецца і надалей. Сапраўдная зіма чакаецца толькі ў другой палове снежня.

**Злавілі серыйнага роварнага злодзея**

27-гадовы мінчук з вясны змудрыўся скрасці больш за 50 ровараў. «На справу» браў заплечнік і кусачкі. Каля гандлёвых цэнтраў прыкмячаў дарагія ровары, зразаў замкі кусачкамі, прасунуўшы іх праз дзірку ў заплечніку. А пасля з'язджаў на ровары, як на сваім. Прадаваў скрадзенае ля рынкаў, а грошы выдаткоўваў на рэстараны.

**Не піянер і не герой**

20-гадовы беспрацоўны з празвішчам Казей падазраецца ў забойстве 47-гадовай маці, загадчыцы аддзелам Музея Вялікай Айчыннай вайны. Спрэчка адбылася на пабытавай глебе ў іх кватэры. У адказ на прэтэнзіі маці сын накінуў ёй на шыю вяроўку...

**«Звязда», БелаПАН, «Еўрарадыё»**

### Прэзентацыі новай «Гісторыі Беларусі ад сярэдзіны XVII да пачатку XXI ст.»

Прэзентацыі новай кнігі Алега Латышонка і Яўгена Мірановіча «Гісторыя Беларусі ад сярэдзіны XVII да пачатку XXI ст.» у Гомелі, Магілёве, Наваполацку і іншых беларускіх гарадах. З удзелам Алега Латышонка.

**12 снежня** (субота), Гомель, 18.00 — вул. Палеская, 52.

**13 снежня** (нядзеля), Магілёў, 15.00 — Палац культуры вобласці (былы ДК «Хімвалакно»).

**13 снежня** (нядзеля), Орша, 18.00.

**14 снежня** (панядзелак), Наваполацк, 19.00 — вул. Алімпійская, 2, офіс Наваполацкай гарадской арганізацыі ТБМ імя Ф.Скарыны.

11–14 снежня запланаваныя таксама сустрэчы з чытачамі ў Гродне, Рэчыцы і Маладзечне. Сачыце за абвесткамі.

Усе прэзентацыі адбудуцца ў рамках кампаніі «Будзьма».

Даведкі праз т.: (029) 550–79–69.


# Пара аформіць падпіску

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764
Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014
Асабовы рахунак:
(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | |

Агулам
Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764
Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014
Асабовы рахунак:
(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | |

Агулам
Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


## Дзякуй падпісчыкам

Сяргею Х. са Столінскага раёна.
І.Б. з Оршы.
Мікалаю В. з Бярозаўскага раёна.
Бернарду П. з Нясвіжскага раёна.
Сяргею Ц. з Докшыцкага раёна.
А.С., Вользе П., В.Ц. са Жлобінскага раёна.
Іне С., В.Ж. з Барысаўскага раёна.
С.Ц., Валерыю П. з Баранавіцкага раёна.
Дзмітрыю Н. з Ліды.
Міхаілу М., В.В. са Стаўбцоўскага раёна.
Ірыне Д. з Іўеўскага раёна.
Алене Дз., Валянціне М. з Навагрудскага раёна.
А.П. са Жлобінскага раёна.
Васілю Б., В.П. са Шчучынскага раёна.
Міхаілу Ш. з Клімавіцкага раёна.

# Пяць плюсаў і пяць мінусаў Пятра Краўчанкі

Былы міністр замежных справаў Пятро Краўчанка працягвае адмаўляцца ад кантактаў з прэсай. Тым не менш, размовы пра магчымае яго вылучэнне кандыдатам у прэзідэнты не сціхаюць. Яго гатовыя падтрымаць Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы. Палітык мае як відавочныя моцныя бакі, так і недахопы. Іх аналізуе «НН».

### 1. Новы чалавек

+ Фігура Пятра Краўчанкі здольная аб'яднаць апазіцыю. Чым бліжэй час выбараў, тым менш размоваў вядзецца пра адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў. Правыя вылучаюць свайго, левыя — свайго. Ніякай кампраміснай фігуры не бачна.

Краўчанка ж не выклікае адчужэння ні ў нацыянал-лібералаў, ні ў камуністаў. У нейкім сэнсе Краўчанка мог стаць новым тварам у апазіцыі. Адмоўны рэйтынг у палітыка нашмат меншы, чым, скажам, у Анатоля Лябедзькі ці Сяргея Калякіна.

— У Краўчанкі няма згуртаванай каманды, з якой ён можа пайсці на прэзідэнцкія выбары. Апошнім часам у СМІ праходзілі паведамленні, што экс-міністр можа ўзначаліць сацыял-дэмакратаў. Але людзей, на якіх Краўчанка можа абаперціся ўжо сёння, у яго няма. Раней ён заяўляў, што ягоную каманду могуць скласці настаўнікі, музейшчыкі. Людзі, якія раней не былі заангажаваныя ў палітыку.

### 2. З наменклатуры

+ Краўчанку як свайго можа прыняць не толькі незалежнае грамадства, але і чыноўнікі. За савецкім часам Пятро Кузьміч імкліва збудаваў партыйную кар'еру. Ужо ў 35 гадоў ён стаў сакратаром Мінскага гаркома партыі, што было нечуваным узлётам. Разам з тым, у найбліжэйшым атачэнні Лукашэнкі амаль не засталося людзей, якія працавалі некалі разам з Краўчанкам.

— Спадзяванні на бунт унутры наменклатуры пакуль не спраўджваліся. Са спадзевам, што чыноўнікі могуць падтрымаць апазіцыйнага кандыдата, вылучаліся Уладзімір Ганчарык у 2001 годзе, Аляксандр Казулін — у 2006 г. Надзеі аказаліся пустымі. Самі ж вылучэнцы так і не змаглі сфармаваць яснай альтэрнатывы і яскравай ідэі.

### 3. Натуральная беларускасць

+ Для Краўчанкі родная з'яўляецца беларуская культура і мова, ён беларускі патрыёт. Краўчанка не чужы чалавек у беларускай прасторы, ён не прыйшоў у яе толькі дзеля палітычных выгадаў. На пасадзе міністра замежных справаў ён рупіўся пра пошукі крыжа Еўфрасінні Полацкай, адкрыццё помніка Скарыну ў Празе. Творчая інтэлігенцыя ведае і цэніць Краўчанку.

— Краўчанка заслужыў славу чалавека-флюгера. Пачынаў як камсамольскі работнік, потым быў перакананым камуністам, працаваў ва ўрадзе Кебіча, згадзіўся на дыпламатычную працу ў Лукашэнкі. На цесную супрацу з дэмакратычнымі сіламі ніколі не ішоў, называючы сябе «больш змястоўнай і памяркоўнай апазіцыяй».

### 4. Досвед і сувязі

+ Краўчанка прайшоў унікальную школу, стаўшы першым міністрам замежных справаў. Фактычна ягонымі намаганнямі паўстала найноўшая беларуская дыпламатыя. Краўчанка быў знаёмы з мноствам уплывовых палітыкаў як на Усходзе, так і на Захадзе. Час сваёй працы ў Японіі Краўчанка акрэслівае як «палітычнае мацаванне».

— Пятро Краўчанка ніколі не выходзіў на першыя ролі, хоць бы і ў малой партыі. Між тым, кінуць выклік Лукашэнку — значыць умець вытрымліваць любыя ўдары. І Мілінкевіч, і Казулін не зламаліся. Тады як Краўчанка заўсёды заставаўся добрым выканаўцам, але не больш за тое. Дый палітыкі, сувязямі з якімі апелюе Краўчанка, у асноўным даўно пасыходзілі на пенсію.

### 5. Манеры

+ Адукаванасць. Краўчанка інтэлектуальна вылучаўся на фоне кіроўнай эліты і ў савецкі час, і ў постсавецкі. Кандыдат гістарычных навук, заядлы кнігалюб. Адзін з нямногіх, пакінуў пра падзеі пачатку 1990-х успаміны ў кнізе «Беларусь на растанях». Выдатна ведае дыпламатычны этыкет, мае дасканалыя манеры.

— Нерашучасць. Ва ўспамінах Краўчанка часта згадвае, што ён мог бы быць найбольш небяспечным канкурэнтам для Лукашэнкі на ўсіх выбарах. Але Краўчанка так і не стаў беларускім прэзідэнтам з нацыянал-камуністаў, як сталі ў Літве Бразаўскас, а ва Украіне — Краўчук. Ён нават не наважыўся балатавацца. Ні ў 1994-м, ні ў 2001-м, ні ў 2006-м. На Плошчы яго таксама не было.

**Зміцер Панкавец**




**Пятро Краўчанка — адзін з імаверных кандыдатаў у прэзідэнты ад апазіцыі.**

## Берлусконі — Лукашэнку: «Ваш народ вас любіць, аб чым сведчаць вынікі выбараў»

**Беларусь наведаў прэм'ер-міністр Італіі Сільвіё Берлусконі. «Такі прыемны мужчына, быў надоўга. Набыў і пайшоў», — падзяліліся ўражаннямі прадавачкі крамы «Крышталь», куды ён завітаў на развітанне.**




Калі не браць у разлік візіты ў нашу краіну расійскіх прэзідэнтаў, гэта першы прыезд у Мінск за часамі Лукашэнкі кіраўніка краіны, якая ўваходзіць у «вялікую васьмёрку». За Шушкевічам сталіцу Беларусі наведваў прэзідэнт ЗША Біл Клінтан.

«Мы ўспрымаем прыезд італьянскага кіраўніка не толькі ў перспектыве двухбаковых адносін, але і як жэст падтрымкі Беларусі на міжнароднай арэне», — сказаў Лукашэнка падчас перамоваў.

«Ваш народ вас любіць, аб чым сведчаць вынікі выбараў», — падлабызніваўся Берлусконі. Італьянскі прэм'ер — «моцны гаспадарнік» заходняга кшталту. Ён збудаваў уласную бізнэс-імперыю. І лабіруе ў свеце інтарэсы італьянскага капіталу, якія не пахнуць. Таму Берлусконі першым быў у Лівіі, першым і ў Мінску. Берлусконі нават выказаў радасць з нагоды стварэння Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі. «Гэта будзе велізарны рынак, куды мы зможам пастаўляць прадукцыю нашых сумесных прадпрыемстваў», — сказаў прэм'ер-міністр.

Лукашэнка заявіў, што Беларусь і Італія адкрылі новы этап партнёрства, «фундаментам якога з'яўляецца ўзаемапаважлівы, шчыры і зацікаўлены дыялог». Сярод канкрэтных дамоваў — урад Беларусі і італьянская «Фінмеканіка С.П.А.» падпісалі мемарандум аб супрацоўніцтве ў сферы транспарту, энергетыкі, космасу, бяспекі і сістэм бяспекі.

«Беларусь гатовая да супрацоўніцтва з Італіяй ва ўсіх сферах. Закрытых для абмеркавання тэм няма», — падкрэсліў Лукашэнка. Пра адсутнасць закрытых тэмаў Лукашэнка гаварыў і кіраўнікам Ірана, Лівіі, Украіны, Арменіі, Сірыі.

«Наша сустрэча дасць выразны палітычны сігнал да пачатку больш актыўнай працы ўрадаў, міністэрстваў, ведамстваў і зялёнае святло рэалізацыі сумесных праектаў», — адзначыў ён.

Выразна было бачна, што перамовы з кіраўніком краіны-чальца ЕС Лукашэнка вёў у кампліментарнай форме — як некалі з Уга Чавесам.

Пасля ўскладання кветак да манумента на плошчы Перамогі кіраўнік урада Італьянскай Рэспублікі вырашыў прагуляцца па беларускай сталіцы. Кароткі шпацыр скончыўся ў краме «Крышталь», што на праспекце Незалежнасці. Там уладальнік футбольнага клуба «Мілан» набыў цукерачніцу і вазу барысаўскай вытворчасці агульным коштам больш чым на 800 тысяч рублёў. Алкагольная прадукцыя аднайменнага мінскага завода Сільвіё Берлусконі не зацікавіла. «Такі прыемны мужчына, быў надоўга. Набыў і пайшоў», — падзяліліся ўражаннямі прадавачкі.

Усяго візіт доўжыўся крыху болей за тры гадзіны. Увечары Берлусконі адляцеў назад у Італію. Характэрна, што першым еўрапейскім візіцёрам у Беларусь быў менавіта неардынарны Сільвіё. Еўрасаюз як бы чарговы раз страхуе перастрахавацца. Нават калі Лукашэнка не адважыцца на больш шырокі разварот у бок Еўропы, можна заўсёды спаслацца на тое, што перамовы вёў скандальны італьянскі лідэр.

**Зміцер Панкавец, Алесь Пілецкі**

## СЦІСЛА

### Дубскага не вызваляць

Моладзеваму актывісту, палітвязню Арцёму Дубскаму адмовілі ва ўмоўна-датэрміновым вызваленні. Спецыяльная камісія палічыла недапушчальным прызначыць УДВ «рэцыдывісту», якім лічыцца Дубскі. У студзені Арцём збіраецца распісацца ў калоніі са сваёй нявестай Настай.

### Макей лічыць неабходным развіваць казацкі рух

Кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей сустрэўся з вярхоўным атаманам грамадскага аб'яднання «Усебеларускае аб'яднанае казацтва» Мікалаем Ярковічам. Макей падкрэсліў, што дзяржава з асаблівай увагай ставіцца да аб'яднанняў, «чыя дзейнасць накіравана на рашэнне агульнадзяржаўных задач». Назіральнікі ўспрынялі сустрэчу як аванс Макея ў адрас прарасійскіх сілаў.

### Лукашэнка: Будзе інфармацыйная кампанія па адмене смяротнага пакарання

«Мы пачынаем шэраг мерапрыемстваў у гэтым кірунку, пачынаючы з парламенцкіх слуханняў і ўзняцця гэтай тэмы ў СМІ», — заявіў кіраўнік Беларусі ў інтэрв'ю італьянскай газеце «Стампа».

**ЗП**

# Мутны мытны саюз

Працяг са старонкі 1.

### Лебедзь, шчупак і рак

Лукашэнка спрабуе ўсяляк паскорыць працэс. У прыватнасці, беларускі бок прапанаваў фармаваць прававую базу адзінай эканамічнай прасторы — трэцяга этапа — як мага шпарчэй, каб канчаткова інтэгравацца ўжо ў 2011 годзе.

Лукашэнка, Мядзведзеў і Назарбаеў павінны вярнуцца да абмеркавання спрэчных пытанняў на сустрэчы ў Казахстане, якая адбудзецца 18 снежня. Але як паказвае досвед стварэння саюзнай дзяржавы, абмяркоўваць падрабязнасці пагаднення можна дзесяцігоддзямі.

### Перамовы працягваюцца

Перамовы наконт уніфікацыі тарыфаў працягваюцца, прычым абодва прэзідэнты час ад часу дзеляцца з журналістамі нечаканымі падрабязнасцямі. Лукашэнка ўвогуле паставіў пад сумнеў задуму: «Шчыра скажу, мяне непакоіць, ці дастаткова абароненыя беларускія інтарэсы». Мядзведзеў у неабходнасці Мытнага саюза не сумняваецца, але ўжо зараз катэгарычна заяўляе: «У наступным годзе цана пастаўкі газа ў Беларусь будзе на 30-40% ніжэйшай за цэны для супастаўляльных краін. Але мы не лічым магчымым ісці на поўную ўніфікацыю тарыфаў». Наконт цэнаў на энерганосьбіты ён гандлявацца не будзе.

Беларусь жа, наадварот, бачыць танны газ адным з асноўных плюсаў магчымага саюза. Калі дармовых энерганосьбітаў не будзе, ці трэба ўвогуле такі саюз Лукашэнку?

**Што не задавальняе Беларусь?**

Маруднае стварэнне адзінай мытнай прасторы

Розныя тарыфы на энерганосьбіты ў Беларусі і Расіі

Павышэнне мыта на замежныя аўтамабілі

### Усё дзеля таннае нафты

А тут яшчэ і Пуцін няўзнак заўважае, што, калі беларусы так балюча ўспрымаюць магчымае падаражанне замежных аўтамабіляў, для краіны можа быць створаны нейкі пераходны перыяд. Але пасля ўсё роўна прыйдзецца падняць мыта да ўзроўню расійскага. Ды і астатнія тарыфы змяніць, бо 92% адзінага мытнага тарыфа — расійскія.

Лукашэнка хоча як мага хутчэй праскочыць першыя два этапы інтэграцыі (гл. табліцу), каб перайсці да адзінай эканамічнай прасторы. У яго разуменні магчымасць вярнуцца да танных энерганосьбітаў перавaжвае рызыку застацца ні з чым пасля двух першых этапаў.

**Ягор Марціновіч**

| Дата стварэння | Назва | Сутнасць |
|---|---|---|
| 1 студзеня 2010 | Мытны саюз | Тавары ад Брэста да Уладзівастока і Алма-Аты перамяшчаюцца вольна, але толькі тыя, якія выробленыя на тэрыторыі Мытнага саюза (МС);<br>санітарныя і тэхнічныя нормы ў кожнай краіны застаюцца свае;<br>мыты на ўвоз тавараў у краінах адрозніваюцца |
| 1 ліпеня 2010 | Адзіная мытная прастора | Тавары імпартуюцца па аднолькавых мытах і вольна перамяшчаюцца па тэрыторыі МС; санітарныя і тэхнічныя нормы ў кожнай краіны застаюцца свае |
| 1 студзеня 2011 | Адзіная эканамічная прастора | Агульны энергетычны рынак; роўныя ўмовы працы суб'ектаў гаспадарання; адзіная транспартная прастора |

**Лукашэнка: «Нічога страшнага, калі мы сюды будзем завозіць менш хламу [легкавых аўтамабіляў] з Еўропы»**

«Мытны саюз — гэта ўзаемныя ўступкі, узаемная падтрымка і вялікі рынак», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Баяцца тут няма чаго».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі, Казахстана і Расіі розныя эканомікі. «Мы, па вялікім рахунку, не такія ўжо і канкурэнты. Ну, дапусцім, калі ў нас ёсць МАЗ, то ў Расіі — КамАЗ. Гэта сведчыць аб тым, што мы павінны абараняць айчынную вытворчасць пошлінамі і г.д. У Казахстане гэтай вытворчасці няма, але яны далучыліся да нас.

У нас няма вытворчасці легкавых аўтамабіляў, а ў Расіі ёсць. Расія хацела б, каб гэты від вытворчасці быў абаронены.

Дапусцім, мы пайшлі насустрач расіянам, тады расіяне пойдуць насустрач нам па іншых пытаннях і гэтак далей», — сказаў ён.

Разам з тым, паводле ягоных словаў, пытанне пошлін на легкавыя аўтамабілі важнае для беларускай эканомікі, таму канчатковага рашэння па ім яшчэ не прынята. «Па фізічных асобах мы гэта пытанне пакуль пакінулі ўбаку. Мы гаворым аб юрыдычных асобах. Легкавы транспарт — гэта, у прынцыпе, адзіная пазіцыя, якая сапраўды хвалюе людзей», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён адзначыў: «Выбачайце, але калі мы сюды будзем завозіць менш патрыманага хламу, то, можа, нічога страшнага ў гэтым няма. Мы выйграем па іншых пазіцыях».

Ён нагадаў, што 30 лістапада ў час сустрэчы з італьянскім прэм'ерам Сільвіё Берлусконі таксама была закранута тэма Мытнага саюза. «Як толькі мы падпісалі дакументы Мытнага саюза, Берлусконі ўжо бачыць не 10−мільённую Беларусь, а вялізную эканамічную прастору, якая адкрываецца праз Беларусь», — сказаў кіраўнік дяржавы. «І куды яны хочуць прыйсці на гэтай прасторы? Менавіта ў Беларусь. Не ў Расію, не ў Казахстан, а сюды, у цэнтр Еўропы», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

«Такім чынам, Мытны саюз, які мы стварылі, крыху паляпшае сітуацыю ў параўнанні з сітуацыяй цяперашняй, — рэзюмаваў ён. — Але трэба разумець, што без Мытнага саюза не можа быць і Адзінай эканамічнай прасторы. А нас менавіта гэта больш за ўсё цікавіць.

І вось у Астане, калі мы сустрэнемся 18 снежня, мы вызначым, у якія тэрміны мы прыйдзем у АЭП».

**БЕЛТА**

**Таццяна Манёнак**, аглядальніца газеты «Белорусы и рынок»

«Пакуль што мы маем толькі дэкларацыю аб утварэнні гэтага саюза. Думаю, гэта будзе такі ж даўгабуд, як і Мытны саюз Беларусі і Расіі, бо ў трох удзельнікаў вельмі розныя эканомікі, розныя інтарэсы».




ВОЛЬГА Ч.

# Да канца года дэвальвацыя складзе яшчэ 2%?

Дзевяць з паловай месяцаў Нацбанк усімі праўдамі і няпраўдамі ўтрымліваў дэвальвацыю на ўзроўні 5%, пасля чаго жалезная рука трохі саслабілася. Апошні ж тыдзень абясцэніў беларускі рубель яшчэ на 2%.

Раней, павышаючы курс адной з валют, Нацбанк памяншаў курс іншай. Рос еўра — падаў даляр. Ці наадварот. Цяпер усе валюты растуць разам.

Сухая статыстыка сведчыць, што за тыдзень еўра падаражэў з 4073 да 4190 рублёў. Даляр — з 2732 да 2782 рублёў, расійскі рубель — з 94,68 да 95,35 рублёў. Узровень дэвальвацыі за гэтыя дні зрушыўся з 6% на 7,90%.

### Хітры Нацбанк

Чаму на краіну зноў папаўзла дэвальвацыя? Незалежны фінансіст Сяргей Чалы не бачыць аб'ектыўных прычын для настолькі рэзкага росту валют: «Рэзерваў хапае, ды і грошы Міжнароднага валютнага фонду паступаюць». На ягоны погляд, Нацбанк вырашыў давесці да канца года кошык да верхняй дазволенай мяжы — да 1056 рублёў. Што гэта дасць дзяржаве? «Падобна на тое, што Нацбанк вырашыў схітраваць. На наступны год таксама запланаваны калідор на 10%. Напэўна, яго вырашылі адлічваць роўна ад 1 студзеня 2010 года», — мяркуе эканаміст. Такім чынам, з'явяцца шырэйшыя магчымасці змяняць курсы валют, прытрымліваючыся абяцанняў, — кошык зможа як вярнуцца да ўзроўню пачатку гэтага года, так і аддаліцца ад яго на 20%.

Сяргей Чалы звяртае ўвагу, што ў адносінах да даляра беларускі рубель абясцэньваецца нашмат слабей, чым да таго ж еўра. Амерыканская валюта падаражэла ўсяго на 5%, у той час як еўрапейская вырасла больш чым на 13%.

**Ягор Марціновіч**

# Бяры, нябожа, што нам нягожа

**На аўкцыёнах па продажы дзяржаўнай маёмасці прадаецца ўсяго каля 5% выстаўленых аб'ектаў.**

Груваcткія спісы, якія складаюцца выканаўчымі ўладамі, змяшчаюць сотні аб'ектаў — ад сельскіх школ і кінатэатраў да кароўнікаў і кацельняў. Попытам карыстаюцца далёка не ўсе. На Гродзеншчыне за два гады аўкцыён праводзіўся па 850 аб'ектах. Збыць удалося ўсяго чатыры дзесяткі...

Чыноўнікі баяцца выстаўляць замалую цану. У выніку аб'екты не выклікаюць цікавасці ў інвестараў. Прастойваючы, яны губляюць у цане, бо прыходзяць у заняпад. Напрыклад, комплекс будынкаў былога вайсковага гарадка ў Гродне прадаваўся за $1,1 мільёна. І прадаецца да гэтага часу. А вось стартавай цаной тэрыторыі плошчай 10 км$^2$ былога вайсковага гарадка на Свіслаччыне назвалі 620 тысяч рублёў. У выніку ўлады выручылі ў 125 разоў больш.

**ЯМ**

## СЦІСЛА

### Дубаі на мяжы банкруцтва

Эмірат Дубаі, другі па велічыні і багацці ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, трапіў на мяжу дэфолту. Найбуйнейшая дзяржаўная кампанія эмірата Dubai World заявіла пра прыпыненне плацяжоў па даўгах на шэсць месяцаў. Дзяржаўны доўг краіны складае $80 мільярдаў, чвэрць з якіх — даўгі таго самага Dubai World, якім валодае спадкаемца ўлады.

### $300 мільёнаў за БПС-Банк

Беларусь хацела атрымаць паўмільярда, а расійскі «Сбербанк» ацэньваў банк у $150 мільёнаў. Сышліся на сярэдзіне. Актывы банка складаюць каля $2 мільярдаў.

### У Кобрыне адкрыўся аквапарк

У аздараўленчы цэнтр увайшлі басейн з воднымі атракцыёнамі, трэнажорная зала, медыцынскі блок з водагразелячэбніцай і лазнямі. Гэта першы падобны аб'ект у вобласці.

### Рэклама Сярогі з 3G каштавала $2,2 мільёна

У кастрычніку больш за ўсіх на тэлерэкламу ў Беларусі патрацілі амерыканскія касметолагі з Procter&Gamble — $2,5 мільёна. Мабільныя Life:) і МТС выдаткавалі прыблізна па $2,2 мільёна.

### У лідэрах па росце цэнаў

Па выніках студзеня-кастрычніка 2009 года Беларусь заняла другое месца сярод краін былога СССР па росце спажывецкіх цэн. Ва Украіне цэны ўзраслі з пачатку года на 10,1%, у Беларусі — на 8,3%, у Расіі — на 8,1%. А вось у некаторых краінах цэны знізіліся — напрыклад, у Эстоніі на 1,7%.

### На «Нёмане» вярнулі старыя заробкі

Працоўныя бярозаўскага шклозавода «Нёман» дасягнулі адмены загаду, які б зменшыў іх заробкі на 30-40%. Больш за тысячу чалавек звярнуліся з калектыўным лістом у міністэрствы, і адміністрацыя прадпрыемства адмяніла свой ранейшы загад.

**ЯМ**

# Забралі ў бізнэсоўца і рынкі, і крамы

**Полацкі магнат Захараў асуджаны на 2,5 года з канфіскацыяй маёмасці. Не за махінацыі ў бізнэсе, а за махлярства са страхоўкай асабістага аўтамабіля BMW X5.**

Уладзімір Захараў, буйны бізнэсовец, які валодаў у Полацку сеткай харчовых крамаў і гандлёвымі цэнтрамі «Стралецкі рынак», «Капітал» і «Еўралюкс», а таксама мясцовай газетай, асуджаны на два з паловай гады пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці і адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Полацкі мясцовы алігарх быў арыштаваны 28 снежня 2008 года. Гэта здарылася пасля скандалу з закрыццём уласных крамаў — такім чынам бізнэсовец пратэставаў супраць праверак. Тады без працы засталіся каля дзвюх тысяч чалавек, у выніку чаго ў горадзе нават успыхнулі стыхійныя мітынгі. Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія арандавалі ў Захарава плошчы, напісалі калектыўны ліст уладам з патрабаваннем навесці парадак. Тыднем пазней «віноўнік беспарадкаў» трапіў у следчы ізалятар.

Як ні дзіўна, Уладзімір Захараў асуджаны не за махінацыі ў сферы бізнэсу, а за махлярства са страхоўкай асабістага аўтамабіля BMW X5 па справе 2001 г. Суд прызнаў найбагацейшага чалавека Полацка вінаватым у інсцэніроўцы аўтааварыі з мэтай атрымання страхоўкі для рамонту джыпа, які раней атрымаў сур'ёзныя пашкоджанні ў рэальным ДТЗ, прычынай якога стала перавышэнне хуткасці спадаром Захаравым. Справа была распачатая ў 2002 годзе, калі страхавая сума ўжо была выплачана цалкам, а затым два разы прыпынялася і аднаўлялася.

Доказ віны полацкага бізнэсоўца быў пабудаваны на сведчаннях адной жанчыны, якая паказала, што сапраўдная аварыя адбылася ў іншы час і ў іншым месцы. Следчым органам удалося «дацісnуць» полацкага алігарха, і ён падпісаў чыстасардэчнае прызнанне і кампенсаваў шкоду страхавой кампаніі ў трохразовым памеры. Акрамя У.Захарава, два з паловай гады атрымаў і адзін з яго саўдзельнікаў. Іншы ўдзельнік інсцэніроўкі — супрацоўнік пракуратуры — абвешчаны ў вышук.

**«Народныя навіны Віцебска»**



# КДБ змагаецца са «шкодным кірункам думак» асобных беларускіх грамадзян

З такім прызнаннем выступіў начальнік УКДБ па Брэсцкай вобласці палкоўнік **Леанід Дзядкоў (на фота)**. «Са шкодным кірункам думак у шырокім сэнсе слова у нас змагаюцца ўсе без выключэння аператыўныя падраздзяленні на замацаваных за імі напрамках работы», — заявіў Л. Дзядкоў у інтэрв'ю СМІ з нагоды 70-годдзя ўпраўлення. Адлік свайго жыцця брэсцкі КДБ вядзе ад сталінскіх часоў.

**Мікола Бугай**

# Невядомыя аднавілі крыж на месцы расстрэла Лапіцкага

«Не ведаю, хто гэта зрабіў, — кажа жыхар Вілейкі Аляксей Сюдак. — Але як убачыў, быў узрадаваны. Калі мы яшчэ першыя крыжы ставілі, я марыў, што людзі будуць прыходзіць і ставіць крыжы самастойна».

Аляксей расказвае, што ведае выпадак, калі маладыя на вяселлі паехалі ўскласці кветкі не да помніка Леніну ў цэнтры Вілейкі, а на месца расстрэлу Лапіцкага ва ўрочышча Красны Беражок.

«Памяць пра Лапіцкага знішчыць немагчыма! Пра яго стала вядома ўсёй краіне. І гэта варта нашых штрафаў», — адзначае Сюдак.

Помнік Лапіцкаму збурылі перад Радаўніцай, потайкі.

Першыя крыжы на верагодным месцы расстрэлу героя нацыянальнага руху Расціслава Лапіцкага ў Красным Беражку паўсталі на дзень яго народзінаў 1 верасня. Праз пэўны час крыжы знішчылі, а вілейчукоў Аляксея Сюдака, Алеся Наркевіча і Уладзіміра Малярчука прыцягнулі да адказнасці. Іх абвінавацілі ў правядзенні несанкцыянаванага мітынгу падчас усталявання крыжоў. Мужчынаў пакаралі штрафамі. Мінскі абласны суд рашэнне пакінуў без зменаў. Цяпер рыхтуецца скарга ў суд вышэйшай інстанцыі.

**Кастусь Матушыч**

**У 1948—1949 гадах Лапіцкі з сябрамі** стварылі ў Смаргоні і Мядзеле антысавецкую падпольную арганізацыю, якая распаўсюджвала ўлёткі. Яна пратрымалася некалькі гадоў, пакуль на яе след не выйшлі савецкія спецслужбы. Допыты, катаванні — і прысуд. Група ставіла сваёй задачай дабіцца незалежнасці Беларусі, што разглядалася савецкім рэжымам як асаблівае злачынства. Удзельнікаў адправілі гніць у канцлагеры, а кіраўнікі — Расціслаў Лапіцкі ды Факунда Несцяровіч — былі асуджаныя на расстрэл. Несцяровіч напісаў прашэнне аб памілаванні, і расстрэл яму замянілі зняволеннем. Расціслаў пісаць прашэнне адмовіўся. Яго расстралялі ва ўрочышчы Красны Беражок ля Вілейкі. Было яму тады 22 гады.

У Мінску яшчэ жыве родная сястра Лапіцкага Вольга, у Касуце захавалася хатка Лапіцкіх — там бацька Расціслава служыў праваслаўным святаром.

Больш пра Расціслава Лапіцкага ў кнізе: **Міхась Чарняўскі. Як пошуг маланкі.** — Мінск: Тэхналогія, 2006.

## ЗДАРЭННІ

### Забілі за 40 тысяч рублёў

Справа па пунктах 1 і 2 часткі 2 артыкула 139 КК распачатая пракуратурай Віцебскага раёна па факце падвойнага забойства ў вёсцы Астрэйкава. Трупы 87-гадовай і 82-гадовай сясцёр з чэрапна-мазгавымі траўмамі былі знойдзеныя ў іх доме 28 лістапада. Жанчыны былі забітыя паленам. Знікла як мінімум 40 тыс. рублёў. Ва ўчыненні злачынства падазраюцца два мясцовыя жыхары. Аднаму з іх 27 гадоў, другому — 22. Старэйшы затрыманы, малодшы знаходзіцца ў вышуку.

### Збітага на пераходзе інваліда яшчэ і адлупілі пасажыры

Сталічная ДАІ шукае кіроўцу аўтамабіля, які на вуліцы Ляшчынскага збіў 30-гадовага пешахода і з'ехаў. Гэта здарылася 29 лістапада ў 0.30 ночы на нерэгуляваным пераходзе ля ўваходу на станцыю метро «Кунцаўшчына». Пасля ДТЗ з аўтамабіля выйшлі некалькі чалавек і адлупцавалі пешахода, затым з'ехалі. Са шматлікімі траўмамі пацярпелы шпіталізаваны. Відавочцаў здарэння просяць патэлефанаваць: (17) 222-08-40, 222-08-26, 222-25-13, 222-17-17 або 102.

### Падлетак са Смалявіч прабіў колы 12 аўтамабіляў

Два жыхары Смалявічаў звярнуліся ў міліцыю са скаргай. Уначы невядомы пашкодзіў колы іх аўтамашын, а таксама яшчэ 10-ці, што стаялі побач. Супрацоўнікі праваахоўных органаў высветлілі, што злачынства здзейсніў 14-гадовы мясцовы жыхар, вучань 8-га класа Смалявіцкай сярэдняй школы. Заведзена крымінальная справа паводле ч.1 арт.339 «Хуліганства» КК. Мера стрымання пакуль не абіралася.

### 35-гадовая жанчына заразіла трох мужчын ВІЧ-інфекцыяй

Крымінальная справа на 35-гадовую кабету за наўмыснае заражэнне ВІЧ-інфекцыяй трох мужчын была распачатая ў верасні. Да слова, маладзіца ўжо прыцягвалася да адміністрацыйнай адказнасці за хуліганства і злоўжыванне алкаголем.

Увогуле, за амаль тры гады гэта ўжо чацвёртая падобная крымінальная справа ў Гродзенскай вобласці. Праўда, адну са справаў спынілі па прычыне смерці 28-гадовага абвінавачанага.

Толькі за 10 месяцаў гэтага года зарэгістравана 50 новых выпадкаў ВІЧ-інфекцыі (у мінулым годзе за той жа перыяд ўсяго 33 выпадкі). Усяго па стане на 1 лістапада зарэгістравана 418 выпадкаў ВІЧ-інфекцыі.

У жніўні 2009 года ВІЧ упершыню быў выяўлены ў Дзятлаўскім раёне. Цяпер у 17-ці з 18-ці раёнаў вобласці ёсць інфікаваныя. Па колькасці зарэгістраваных выпадкаў ВІЧ-інфекцыі «лідзіруюць» Ліда (223), Гродна (62) і Слонім (39).

### 18-гадовы аршанец пырнуў нажом супрацоўніка ДАІ

Справа паводле падазрэння ў замаху на забойства супрацоўніка міліцыі (ч. 1 арт. 14 і арт. 362 Крымінальнага кодэкса) распачата пракуратурай Віцебскага раёна.

Як паведаміў БелаПАН пракурор Віцебскага раёна Вячаслаў Скрыцкі, малады чалавек, затрыманы супрацоўнікам ДАІ Сененскага РАУС за кіраванне аўтамашынай у стане алкагольнага ап'янення, нанёс міліцыянеру некалькі ўдараў нажом.

Цяпер 28-гадовы пацярпелы знаходзіцца ў Віцебскай абласной клінічнай бальніцы. Той, хто ўчыніў напад, затрыманы.

Інцыдэнт адбыўся ў першай гадзіне ночы 29 лістапада на мяжы Віцебскага і Сененскага раёнаў.

**МБ; БелаПАН; БЕЛТА; Блог Гродна s13**

# Тэракт ці раздзяўбайства?

Якія б ні былі прычыны крушэння «Неўскага экспрэса», яны не на руку Пуціну.

У Расіі чарговы тэракт. У ноч на суботу падарваны «Неўскі экспрэс» — фірмовы цягнік, які звязвае Маскву з Пецярбургам. Тры з 14-ці вагонаў скаціліся пад адхон. У выніку трагедыі загінула не менш за 26 чалавек, 92 параненыя, з іх 9 — у цяжкім стане. Без звестак зніклі, паводле звестак МНС Расіі, чатыры чалавекі. Цягнік перавозіў 661 пасажыра і 21 члена цягніковай брыгады.

Версія аб тэракце ўзнікла адразу ж па аварыі. На чыгуначным палатне знайшлі варонку дыяметрам паўтара метра, а сведкі адзінагалосна заявілі, што чулі выбух. У 2007 годзе ўжо рабілася спроба падарваць гэты цягнік — тады абышлося без ахвяраў. Галоўнымі падазраванымі тады сталі баевікі Павел Касалапаў і Доку Умараў.

Імёны падазраваных ў тэракце 27 кастрычніка пакуль не агалошваюцца. Вядома толькі, што тутэйшыя бачылі ля чыгункі незнаёмца — каржакаватага, рудавалосага, узростам гадоў каля сарака. Расійскія спецслужбы знайшлі меркаваную базу тэрарыстаў.

І гэта пры тым, што выбуховае прыстасаванне было закладзена ў ажыўленым месцы — непадалёк жылыя дамы і электрападстанцыя. На тое, каб закласці бомбу, у злачынцаў было паўгадзіны — за 44 хвіліны да «Неўскага экспрэса» тут паспяхова прайшоў іншы цягнік. А выбуховых прыстасаванняў было два — другое спрацавала толькі ў суботу днём, і яго не заўважылі нават супрацоўнікі спецслужбаў, якія аглядалі месца выбуху.

Усё гэта ўказвае на прафесіяналізм тэрарыстаў. Пусціць пад адхон адзін з самых прэстыжных цягнікоў у Расіі, якім карыстаюцца высокія чыноўнікі і вядомыя бізнэсоўцы, і знікнуць з месца злачынства — няпроста. Здзейсніў гэта дасведчаныя асобы, а заявы малавядомай ультранацыяналістычнай арганізацыі аб дачыненні да падрыву цягніка падобныя да самарэкламы.

Да сёння нераскрытымі засталіся падрывы жылых дамоў у Маскве ў 1999-м. Тады шмат пытанняў выклікалі дзеянні спецслужб і іх таямнічыя вучэнні з выкарыстаннем сапраўднай выбухоўкі. Расійскае грамадства пасля тых выбухаў прагнула моцнай улады і атрымала яе ў асобе Пуціна. Здавалася, у Расію прыйшоў спакой — нават вайна ў Чачні паступова трансфармавалася ў контртэрарыстычную аперацыю. Аднак тэракты працягваліся. Быў «Норд-Ост». У 2004-м адбыўся адзін з самых жахлівых за ўсю гісторыю — захоп школы ў Беслане. А падрыў «Неўскага



экспрэса» толькі запэўніў расійскае грамадства ў няздольнасці ўладаў абараняць яго інтарэсы.

Пасля абвалу міфа аб паспяховасці гаспадарчага развіцця абвальваецца міф аб бяспецы і канчатковай перамозе над тэрарыстамі. Калі ў СМІ з'явілася інфармацыя аб тэракце, расійская благасфера адразу ж напоўнілася меркаваннямі, што такім чынам улады прагнуць запалохаць грамадства. Гэта ж наколькі трэба не давяраць кіраўніцтву, каб прапанаваць такую версію?

Тым часам на форумах расійскіх чыгуначнікаў абмяркоўваецца версія, што прычынай аварыі «Неўскага экспрэса» стаў зусім не тэракт, а непрыстасаванасць каляіны. Маўляў, рэйкі не вытрымалі ціску хуткаснага цягніка. Такая версія для Крамля яшчэ горшая за тэрарызм. Пасля катастрофы на Саяна-Шушанскай ГЭС чарговая гучная аварыя падарвала аўтарытэт Расіі.

**Алесь Пілецкі**

### Альтэрнатыўная версія

**Прычынай аварыі «Неўскага экспрэса» магло стаць разбурэнне каляіны, выкліканае непрыстасаванасцю чыгункі да хуткаснага руху. За гадзіну да аварыі на гэтым жа ўчастку праходзіў выпрабаванне новы хуткасны цягнік «Сапсан».**

FREEВОЛЬНАСЦІ

## Жаночая віягра

Дэпрэсія, аўрал на працы, пару лішніх кіло пасля святаў — і жаданне дзяліць ложак з каханым знікае. Зрэшты, размова не пра фрыгіднасць, а пра тое, што навукоўцы анансавалі выпуск прэпарата ад жаночай халоднасці.

Вынаходніцтва было зроблена выпадкова. Супрацоўнікі кампаніі Boehringer, што распрацоўвае антыдэпрэсанты, нечакана выявілі: хімічнае злучэнне «флібанзэрын» хоць і не паляпшае прыгнечаны стан паддоследных, але актывізуе іх сэксуальны апетыт. Навукоўцы сцямілі, на парозе якога адкрыцця яны стаяць, і працягнулі эксперыменты.



У лістападзе 2009-га кампанія аб'явіла, што флібанзэрын выклікае ярка выражаны сэксуальны апетыт у жанчын. Эфект таблеткі праяўляецца праз 3—6 тыдняў штодзённага ўжывання.

«Жаночая віягра» зрабіла сенсацыю ў галіне фармацэўтыкі. Раней лічылася, што на жаночае лібіда мала што ўплывае, акрамя гарачага пацалунку. Таму, мабыць, кампанія Pfizer, вытворца звычайнай віягры, пакінула надзею прыдумаць жаночы варыянт «сіняй таблеткі». Флібанзэрын жа, у адрозненне ад «віягры», якая ўздзейнічае на працэс механічна, уплывае наўпрост на мазгавыя цэнтры жанчыны.

Паколькі ад паніжанага лібіда пакутуе чвэрць жанчын дзетароднага ўзросту, вытворцы падлічылі, што будуць зарабляць на прэпараце да 2 млрд еўра ў год. Дзіўна, што адкрыццё зробленае толькі зараз. Тое, што «кропка G» знаходзіцца ў жанчын менавіта ў мозгу — ісціна, вядомая не адзін дзесятак гадоў.

**Вольга Жарнасек**

## Мінюст будзе адсочваць, каб у Расіі пісалі «Беларусь»

На пасяджэнні аб'яднанай калегіі міністэрстваў юстыцыі Беларусі і Расіі 26 лістапада ў Мінску беларускі бок ініцыяваў разгляд пытання аб прававых аспектах выкарыстання афіцыйнай назвы Рэспублікі Беларусь у актах дзяржаўных органаў РФ. Цяпер выкарыстоўваюцца назвы «Белоруссия» і «Беларусь». А транслітэрацыя назвы краіны на замежныя мовы павінна адбывацца ў адпаведнасці з вымаўленнем. Міністр юстыцыі Расіі Аляксандр Канавалаў адзначыў, што выдасць распараджэнне правяраць, каб у нарматыўных актах пісалася «Беларусь». Тэма напісання афіцыйнай назвы краіны закраналася і падчас інтэрв'ю Дзмітрыя Мядзведзева беларускім журналістам у Барвісе 23 лістапада.

Тым часам навуковы сакратар Інстытута расійскай мовы РАН Уладзімір Пыхаў лічыць, што «ў расійскай мове датычна да суседняй краіны ёсць адна норма — «Белоруссия», якую і трэба выконваць. Гэта тычыцца як мовы штодзённага ўжытку, так і сродкаў масавай інфармацыі», перадаў тэлеканал «Россия».

**БелаПАН; Вольга Жарнасек**



**Гродзенскія кавалі Юры Круш і Андрэй Вашкелевіч зрабілі для Мірскага замка ахоўнікаў — металічных рыцараў. На выкананне працы, якая лічыцца найвышэйшым пілатажам кавальскага майстэрства, яны выдаткавалі шэсць месяцаў і каля 300 кг жалеза.**

## СЦІСЛА

### Кожны чацвёрты шлюб у сталіцы заключаецца з замежнікамі

30 лістапада дэпутаты палаты прадстаўнікоў ратыфікавалі пагадненне між урадамі Беларусі і Расіі аб узаемным унясенні адзнак аб заключэнні або скасаванні шлюбу ў пашпарты. Штогод ў Беларусі заключаецца каля 90 тыс. шлюбаў, скасоўваецца — каля 36 тыс. У сталіцы кожны чацвёрты шлюб заключаецца з іншаземцамі, 17—20% з іх — з грамадзянамі Расіі. У краіне ў цэлым доля шлюбаў з замежнікамі на парадак меншая.

### 70% жыхароў Баранавіч лічаць, што ВІЧ-інфікаваных неабходна ізаляваць

Са 100 апытаных гараджан 15% панічна баяцца хворых на СНІД, 20% адчуваюць да іх адчужэнне, 70% лічаць, што ВІЧ-інфікаваных трэба ізаляваць. На 1 лістапада ў рэгіёне зарэгістравана 82 выпадкі ВІЧ-інфекцыі, 63 з якіх — у Баранавічах. Большасць хворых — маладыя людзі ва ўзросце ад 20 да 29 гадоў. Самым распаўсюджаным шляхам перадачы ВІЧ-інфекцыі застаецца ін'екцыйны сярод наркаманаў.

### «Мінск Крышталь» пачне ліцэнзійны разліў рому і тэкілы

Ром будзе пастаўляцца ў Беларусь з Кубы і Венесуэлы, тэкіла — з Мексікі. Плануецца разліваць па 5 тыс. дал кожнага віду прадукцыі ў год.

### У Гродна прыбыў рэйкавы аўтобус

На ім да гродзенскіх калегаў прыехала дэлегацыя польскіх транспартнікаў з Быдгашча. Камфартабельны салон абсталяваны сістэмай відэаназірання. Цягнік можа развіваць хуткасць да 120 км/г і адаптаваны да шырокай чыгуначнай рэйкі, якая выкарыстоўваецца ў краінах СНД. Кампанія зацікаўленая прадаваць такія міні-цягнікі і ў Беларусь.

**Ірына Трубач, БЕЛТА, фота prosto-free.livejournal.com**



# Паўстанцам выдзелілі стадыён

**У Слуцку адзначылі гадавіну Слуцкага збройнага чыну.**



АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

28 лістапада ў Слуцку адбыўся мітынг, прысвечаны 89-м угодкам Слуцкага збройнага чыну. Гарадскія ўлады выдзялілі для яго цэлы стадыён. Аднак з усяго 65-тысячнага Слуцку ушанаваць памяць змагароў-случчакоў наважылася тры дзясяткі чалавек.

Агулам на мітынг сабралося чалавек каля сямідзесяці. Палова прыехала з сталіцы і з суседняга Салігорску.

Міліцыянты паводзілі сябе карэктна. Дзіва што: арганізатары мусілі заплаціць за іх паслугі каля 400 тысячаў рублёў. Адзін з міліцыянтаў на ўваходзе выявіўся добра падкаваным у гісторыі паўстання: калі яшчэ вучыўся ў школе, выцягнуў на экзамене білет пра Слуцкі збройны чын. Адказаў на моцную чацвёрку. «Мы сваю гісторыю шануем», — усміхнуўся праваахоўнік.

Зрэшты, случчакі свае веды пра паўстанне публічна выяўляць не спяшаюцца. Мясцовая незалежная газета «Інфа-Кур'ер» (тыраж 7300 асобнікаў) давала абвесткі пра мітынг у двух нумарах. « У горадзе тысячы тры асобнікаў разыходзіцца, — разважае пенсіянер Міхась Тычына, адзін з тых нямногіх жыхароў горада, якія прыйшлі на мітынг. — Людзі ж прачыталі, нехта ж купіў у кіёску — а вось не прыйшлі... Загадка!»

Гледзячы на стадыён, разумееш: звычайнаму слуцкаму рабочаму ці настаўніку трэба мець пэўную мужнасць, каб, седзячы на ланцужку «працоўнага кантракту», прайсці пад пільным поглядам мясцовых ідэолагаў за жалезную агароджу, туды, дзе адбываецца мітынг пад бел-чырвона-белымі сцягамі. Які, да таго ж, фільмуецца «чалавекам у цывільным». Цяжка зрабіць масавым свята, калі дзяржава дагэтуль ставіцца да яго падазрона і ўсяляк яго замоўчвае.

Прысутны на мітынгу Аляксей Янукевіч, старшыня Партыі БНФ лічыць, што святкаванне 90-й гадавіны Слуцкага збройнага чыну ўдасца арганізаваць лепей: «Калі гэту працу пачаць загадзя, мэтанакіравана — і мы збіраемся гэтым заняцца — больш людзей возьме ўдзел».

Ніна Стужынская, гісторык, якая актыўна займаецца даследаваннем Слуцкага збройнага чыну, мяркуе: «Хацелася б, каб гэта быў шэраг мерапрыемстваў, каб шмат людзей было задзейнічана, каб Случчына прагрымела».

На мітынгу прагучалі канкрэтныя прапановы. Партыя БНФ збіраецца наладзіць выпуск каляндарыкаў і постэраў, прысвечаных Слуцкаму збройнаму чыну. Антон Астаповіч, старшыня Таварыства аховы помнікаў, заклікаў усталяваць да юбілея крыж на брацкай магіле паўстанцаў-случчакоў у вёсцы Агароднікі.

Мітынг нельга назваць няўдалым. Атмасфера была прыязная. Сабралося цеснае кола аднадумцаў. Аднак святкаванне 90-х угодкаў Слуцкага збройнага чыну мусіць быць праведзена на якасна іншым узроўні. Для гэтага трэба вялікая супольная праца гісторыкаў, палітыкаў, журналістаў ды творцаў. Не лішняй была б і падтрымка дзяржавы. На яе, на жаль, пакуль што спадзявацца не даводзіцца.

**Алесь Кудрыцкі**

# «Людзі хацелі знайсці прытулак у нацыянальным доме»

**У чым была сутнасць Слуцкага збройнага чыну 1920 г.? Гутарка з гісторыкам Нінай Стужынскай.**

**«НН»: Слуцкі збройны чын быў справай дзівакоў-ідэалістаў ці масавай з'явай?**

**Ніна Стужынская:** Гэта быў шырокі, падрыхтаваны, палітычна выразны рух. Гэта водгук падзеяў Першай сусветнай вайны. Малыя народы Еўропы выкарысталі развал імперыяў для таго, каб стварыць нацыянальныя дзяржавы. Беларусы таксама не гублялі часу. Што да Расіі, дык яна, пад акампанемент нацыянальнай палітыкі і абароны інтарэсаў нацыянальных ускраін, па сутнасці ўзяла курс на адраджэнне імперыі.

**«НН»: Але як здолелі арганізатары пераканаць людзей падтрымаць паўстанне?**

**НС:** Ведаеце, людзі паверылі! Пераканаліся, што гэта вельмі важная справа — Беларуская Народная Рэспубліка. Што фармаванне свайго войска — гэта сур'ёзна і надоўга. Адкрыліся школы для падрыхтоўкі афіцэраў, нават форму распрацавалі.

Вось, напрыклад, Іван Мацэля — абсалютна бліскучы беларускі герой, малады клецкі хлопец, які за тры дні склікаў народную міліцыю. Спачатку яна налічвала 500 чалавек, а потым дарасла да чатырох тысяч. Агулам у паўстанні ўдзельнічала недзе да дзесяці тысячаў чалавек. У Слуцк сцякалася шмат люду, які хацеў паваяваць.

**«НН»: Але чаму менавіта ў Слуцк?**

**НС:** Гэты край вельмі адметны ў Беларусі па сваіх культурных і эканамічных традыцыях. Случчына — жытніца Міншчыны. Землі добрыя, урадлівыя. Адгэтуль і апетыты з боку Расіі і Польшчы на гэты край.

Сялянства Случчыны мела ў сваім складзе дастаткова вялікі кампанент праваслаўнай шляхты. Што такое шляхта? Гэта людзі служывыя, гатовыя ў любы момант узяць зброю. Вельмі шмат моладзі ўжо мела досвед вайны, многія былі афіцэрамі. Яны вярнуліся дахаты маладымі, амбітнымі, са зброяй у руках. Стрэльба была ў той момант у кожнай вёсцы, і не адна. Паваяваўшы на франтах Першай сусветнай, яны пабачылі імкненні еўрапейскіх народаў да самастойнасці і дзяржаўнасці.

Жыхары Случчыны выявілі выразнае імкненне да адукацыі, асветніцтва, моду на стварэнне нацыянальных гурткоў. Гэта, можна сказаць, былі аналагі сучасных няўрадавых арганізацыяў. Гэта былі гнёзды, адкуль распаўсюджвалася «нацыянальная хвароба».



**Ніна Стужынская**

гісторык, кандыдатам навук, даследчыца Слуцкага збройнага чыну.

Чарвякову штомесяц клаліся на стол справаздачы, што людзі на месцах не жадаюць прызнаваць ніякай улады, акрамя Беларускай Народнай Рэспублікі.

У гэты час Еўропу захліснула мода на левыя настроі. Нездарма ў слуцкіх падзеях галоўнымі былі эсэры. Партыя левая, дастаткова экстрэмісцкага кшталту. Эсэры былі паспяховымі ў справе рэкрутынга, у зборы чалавечага рэсурсу. Там, дзе была школа, настаўнік абавязкова быў эсэрам.

Асноўнымі ўдзельнікамі гэтага працэсу былі, канечне, маладыя людзі. Большасць з іх нарадзілася пры канцы 90-х XIX ст. ці на пачатку XX ст. Гэта была эпоха маладых.

**«НН»: Аднак польскі бок, здаецца, таксама глядзеў на гэтыя падзеі без асаблівай сімпатыі?**

**НС:** Абсалютна. Польшча здолела дамовіцца з чырвонай Расіяй. Яна была цалкам задаволеная падзелам беларускіх земляў, адыходам да яе такой вялікай тэрыторыі. Людзі, якія імкнуліся да адзінства Беларусі, да нацыянальнага самавызначэння, былі Польшчы не патрэбныя. Навошта была такая нацыянальная скула палякам? Беларусы апынуліся паміж молатам і кавадлам.

**«НН»: Ці быў Слуцкі збройны чын чыста лакальнай падзеяй?**

**НС:** Я лічу, гэта была падзея агульнабеларуская. Паўстанне праходзіла на фоне падобных, але менш вядомых выбухаў пратэсту. Тады хваляваліся ўся Барысаўшчына, выступы былі каласальныя. Я праглядала матэрыялы Рэўкама Беларусі, які ўзначальваў нацыянал-камуніст Алесь Чарвякоў. Усю восень 1920 г. яму на стол клаліся штомесяц справаздачы, што людзі на месцах не жадаюць прызнаваць ніякай улады, акрамя Беларускай Народнай Рэспублікі. Пра тое, што Барысаўшчына была ахоплена рухам «зялёных», якія, па сутнасці, кіравалі ўсімі падзеямі. Савецкай адміністрацыі, лічы, не было: рэўкамы недзе хаваліся. А калі лепей паскрэбсці гэтую гісторыю, дык трэба яшчэ паглядзець, ці былі там увогуле тыя рэўкамы, бо міфаў настваралі за гады савецкай улады — будзь здароў. Падзеі ў Слуцку былі найбольш яскравымі, найбольш падрыхтаванымі, але не адзінымі такога кшталту.

**«НН»: Якія ўрокі можна вынесці з тых падзеяў?**

**НС:** Вельмі ясныя. Наяўнасць арганізацыйнага цэнтра, наяўнасць каманды — гэта вялікая справа. Былі і харызматычныя лідэры. Я яшчэ гутарыла са сведкай падзеяў, Аўгінняй Грыцкевіч, якая на пытанне пра тое, чаму адным з першых арыштавалі Юрку Лістапада, адказала: «Ён быў лепшы за ўсіх».

Чаму заклік да абароны Беларускай Народнай Рэспублікі знайшоў такі водгук у сэрцах случчакоў? Бо гэта быў абсалютна прагматычны падыход: людзі стаміліся ад адсутнасці законнасці. Ішлі чырвоныя — рабавалі, прыйшлі немцы — таксама, палякі прыйшлі — зноў тое самае. Пра што гаварылі сяляне на З'ездзе Случчыны? Калі ўтрымліваць уладу — то сваю. Калі карміць армію — то сваю. Людзі хацелі абараніцца, хацелі знайсці прытулак у нацыянальным доме. На працягу 1918 — 1920 г. ідэя нацыянальнай дзяржавы ўжо большменш знайшла сваіх прыхільнікаў сярод простых людзей.

**«НН»: Ці можна знайсці нейкія паралелі паміж тым, як паводзілі сябе кіраўнікі паўстання і сучасныя апазіцыйныя палітыкі?**

**НС:** Па-першае, Слуцкі збройны чын — гэта была палітычная воля не нейкай адной партыі, але многіх арганізацыяў, многіх накірункаў у беларускім руху. Па-другое, была пэўная іерархія, выканаўчая дысцыпліна. Існаваў падзел паміж стратэгамі і тактыкамі. У нас жа сёння што ні палітык — то лідэр. Усе — правадыры.

Я лічу, што кіраўнікі Слуцкага збройнага чыну былі больш спелымі палітыкамі. Але ж у іх і досвед быў! Той самы Павал Жаўрыд — ён быў і ў Туркестане, і на франтах Першай сусветнай, ён быў арыштаваны «чэка», сядзеў у Смаленскай турме.

Але ёсць і падабенства з сучаснасцю: паміж кіраўнікамі Слуцкага паўстання не было згоды. Паміж вайскоўцамі штаба Слуцкай брыгады і Радай Случчыны былі ўвесь час рознагалоссі, якія вельмі негатыўна паўплывалі на ходу падзеяў. Вайскоўцы са штабу былі за тое, каб прыняць вайсковую дапамогу Булак-Булаховіча. Рада Случчыны была рэзка супраць гэтага.

**«НН»: Але ці слушна казаць, што слуцкія змагары пацярпелі паразу? Што ні кажы, а Беларусь сёння — незалежная краіна.**

**НС:** Падмурак яны заклалі, ці не так? Гэтая была нацыятворчая, дзяржаватворчая падзея. У тагачаснай палітычнай прасторы загучалі лозунгі незалежнай, дзяржаўнай Беларусі. Чым больш вывучаеш біяграфіі ўдзельнікаў паўстання, тым больш цешышся. Вельмі маладыя, вельмі прыгожыя, адукаваныя — гэта цэлая галерэя нацыянальных герояў.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**

# Ударыўся галавой у бардзюр між райаддзеламі міліцыі і КДБ

**Забойства ці здарэнне? У Мар'інай Горцы загінуў распаўсюднік незалежнай прэсы.**

Сябар Партыі БНФ з Мар'інай Горкі Валянцін Доўнар памёр 26 лістапада ў шпіталі. Яму быў 51 год. Міліцыя лічыць, што гэта не забойства, а здарэнне: «Паваліўся, ударыўся аб асфальтавую тратуарную плітку». Сябры ў такую версію следства не вераць.

## Хатняя аранжарэя

Здарэнне адбылося 20 лістапада вечарам. Валянцін Доўнар, як заўсёды, позна ўвечары вярнуўся на электрычцы з Мінска з працы. Ён шмат гадоў працаваў страхавым агентам у «Белдзяржстраху».

Мар'іна Горка — недалёкі свет, усяго за 60 кіламетраў ад Мінска. Шмат хто з жыхароў мястэчка вось так ездзіць на працу ў сталіцу і назад. Так і Валянцін Доўнар штодня садзіўся а шостай раніцы на электрычку і вяртаўся а дзевятай.

Валянцін Доўнар меў 51 год. Быў нежанаты, жыў адзін. Ягоны дом знаходзіцца на вуліцы Фрунзэ, што за чыгуначнымі пуцямі. Вялікі дом, нядаўна пабудаваны, з чырвонай цэглы. У дом Валянцін укладваў шмат сілаў. Ён усё яшчэ стаіць крыху недабудаваны, на двары валяюцца прылады працы, у доме ляжаць мяшкі з цэментам. Аднаму адужаць такую будоўлю было нялёгка, але не кідаў.

На падворку бегаюць каты, якіх у Доўнара было шмат. У мяне атрымалася налічыць чатырох, і зусім не факт, што гэта ўсе. Былі ў гаспадарцы таксама качкі і куры, яны таксама з цікавасцю ўзіраюцца ў гасцей.

У хаце цэнтральнага ацяплення няма, зімой даводзілася кожны дзень тапіць. І неяк паспяваў за ўсім гэтым сачыць, хоць і вяртаўся дадому позна ўвечары.

А яшчэ не забываўся на сваё хобі — вырошчванне кветак. У хаце ў сп.Доўнара сапраўдная аранжарэя. Усе гэтыя расліны ён вырошчваў з вялікай любоўю і пяшчотай. Сябры і калегі кажуць, што Доўнар вельмі любіў дарыць людзям кветкі, прыносіць імі радасць.

## Разносіў газеты

У Партыю БНФ Валянцін Доўнар уступіў у 1997 годзе. Пасля рэферэндуму 1996 года. У лідэры ніколі не імкнуўся, але працаваў сумленна.

У Мар'інай Горцы спадара Валянціна ведалі найперш як распаўсюдніка незалежнай прэсы. Шмат гадоў ён разносіў падпісчыкам свежыя нумары «Народнай волі», «Новага часу», раней — «Згоды». «Разносіў газеты і ў дождж, і ў мароз», — кажа сябар памерлага Сцяпан Кульчанка.

Галоўны рэдактар «Новага часу» Аляксей Кароль кажа, што ў тую пятніцу ён таксама забраў свежы нумар выдання — у адмысловай скрыні яго не было. Разнесці не паспеў. Сябры думаюць, што ён аказаўся з іншага ад свайго дома боку дарогі менавіта таму, што нёс закінуць падпісчыкам у скрыні свежы нумар выдання.

## Знайшлі ў самым людным месцы

Міліцыя сцвярджае, што цела Валянціна Доўнара знайшлі недалёка ад чыгуначнага вакзала. Тут побач кінатэатр «Кастрычнік», а таксама бар «Тэхас». Больш люднага месца ў малой Мар'інай Горцы ўявіць цяжка. Тым больш, што ў кінатэатры па пятніцах вечарамі праходзяць дыскатэкі. Бар таксама з'яўляецца адным з самых папулярных месцаў адпачынку для моладзі.

Вядома, цела магло быць нябачным праз кусты, але яны не такія ўжо вялікія, каб не згледзелі. За 200 метраў ад месца здарэння знаходзіцца Пухавіцкі РАУС. Ці не самы дагледжаны і новы будынак у горадзе. Некалькі гадоў назад адбудавалі вялізны гмах, які вылучаецца на фоне астатніх мар'інагорскіх пабудоваў. Тут сама побач КДБ, але будынак невялікі.

Паводле версіі следства, тут «паддаты» Валянцін Доўнар ударыўся галавой аб бардзюр. «Хуткая дапамога» даставіла пацыента ў рэанімацыю, дзе ён правёў шэсць дзён. Уратаваць Валянціна так і не змаглі, ён памёр 26 лістапада не прыходзячы ў прытомнасць.

На нашу просьбу супрацоўнікі «хуткай дапамогі» прабілі па электроннай базе здарэнне з Доўнарам. Кажуць, што 21 лістапада не было ніводнага выкліку. Высветліць у гарадской бальніцы, калі ж прывезлі мужчыну, не ўдалося. У прыёмным пакоі быў новы журнал, заведзены толькі з 23 лістапада.

Чаму маўчалі мясцовыя апазіцыянеры? Чаму да смерці гэты інцыдэнт так і не займеў гучання? «Спадзяваліся, што Валянцін апрытомнее. Раскажа сам усё, што з ім адбылося. Баяліся зрабіць нейкія няправільныя вывады. На жаль, не апрытомнеў», — расказвае рэдактар малатыражнай мясцовай «Мар'інагорскай газеты» Вольга Кульчанка.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Непрытомнага Валянціна Доўнара знайшлі ля гэтага тратуара. Калі верыць міліцыі, ён праляжаў тут, за кусцікамі, некалькі гадзін.**

## Не піў

Развітанне з Валянцінам Доўнарам адбывалася ў суботу ў доме ягонай маці на вуліцы Валадарскага. Побач з хатай стаяць два падпітыя мужчыны. Кажуць, што суседзі. Адразу цікаўлюся, ці піў памерлы. «Не, не піў ніколі. Я вось піў, п'ю і буду піць», — кажа адзін з сябрукоў. Ягоная версія, што забілі сябра падлеткі, каб адабраць грошы і рэчы.

У невялікай хаце са сціплым інтэр'ерам удалося троху пагаварыць з забітай горам маці Валянціна Рыгораўнай. Яна не сумняваецца, што гэта забойства. Кажа, што рэчаў пры ім не знайшлі ніякіх. Ні пашпарта, ні мабільніка, ні грошай.

«Працаўнік, харошы чалавек быў. І на табе — і хто, і што — і па галаве білі», — кажа маці.

Родны брат Валянціна публічна абяцае адпомсціць забойцам. Ён урачыста паведамляў, што падцягнуў да расследавання КДБ. І нібыта гэтай справай ужо займаецца шэсць чалавек з камітэта. Цяжка сказаць, колькі ў гэтых словах было праўды, а колькі прыдумкі. Брат таксама не сумняваецца, што Валянціна забілі.

## Калегі слёз не хавалі

Калег па працы з Мінска прыехаў цэлы аўтобус. Чалавек трыццаць. Слёз не хаваў ніхто. Асабліва маладыя дзяўчаты. Некаторых ледзь супакойвалі. Доўнара цанілі на працы.

Ірына Эдуардаўна шмат гадоў адпрацавала разам з памерлым у кампаніі. «Я ніколі яго не бачыла п'яным, ніколі. Нават калі мы адзначалі нейкія святы. Ён заўсёды хадзіў з усмешкай, прыносіў нам кветкі, выглядаў заўсёды цудоўна. Гэта поўная хлусня, што ён быў п'яным. Хіба можна проста так узяць і ўзвесці паклёп на зусім непітушчага чалавека?»

З Мінска прыехаў Алесь Міхалевіч, які некалі быў дэпутатам пухавіцкага райсавета, а таксама Аляксей Кароль з «Новага часу».

## Абыякавасць партыйных босаў

Непрыемна ўразіла, што не было ніводнага чалавека з кіраўніцтва БНФ. Старшыня Аляксей Янукевіч знаходзіўся на мемарыяльным мітынгу ў Слуцку, ягоны намеснік Ігар Лялькоў — у Кіеве, дзе быў іншы намеснік, Рыгор Кастусёў, кіраўнік абласной арганізацыі, сябра ўправы, цяжка сказаць. Чалавек аддаў не адзін год Партыі, а па смерці партыйцы нават не падумалі пра вянок у памяць.

Затое няма чаго наракаць на мясцовых апазіцыянераў, сяброў Доўнара. Увесь цяжар па падрыхтоўцы пахавання яны ўзялі на сябе. Нават магілу сваімі сіламі капалі.

## «Занадта інтэлігентны, каб справакаваць напад»

«Ён занадта інтэлігентны, каб справакаваць напад. У канфліктнай сітуацыі заўсёды знаходзіў супольную мову з рознымі людзьмі. Таму для ўсіх, хто яго ведаў, гэта здарэнне — шок. У галаве не ўкладваецца, што яго забілі», — кажа Сцяпан Кульчанка.

«Чалавек быў бяскрыўдны, як дзіця. Усе яго паважалі. Вазіў газеты да нас», — працягвае аднапартыец Алесь Васьковіч.

«Валянцін такі чалавек, які ніко-

# Справу не завялі

Кіраўнік крымінальнага вышуку Мар’інай Горкі Яўген Кульбіцкі ў панядзелак згадзіўся паразмаўляць з карэспандэнтам «Нашай Нівы».

**«НН»: Справа па факту смерці Валянціна Доўнара заведзеная?**

**Яўген Кульбіцкі:** Не, не завodзілі. Калі пракуратура вырашыць, што гэта было забойства, то і завядзе.

**«НН»: А якой версіі прытрымліваецца следства?**

**ЯК:** Упаў.

**«НН»: А дзе яго знайшлі?**

**ЯК:** Побач з кінатэатрам «Кастрычнік».

**«НН»: А якой гадзіне?**

**ЯК:** Дзесьці апоўначы. Ці ўжо нават была першая гадзіна.

**«НН»: Рэчы ў Доўнара былі пры сабе?**

**ЯК:** Пашпарт быў. Грошай і мабільніка не было.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Хавалі Валянціна Доўнара з матчынай хаты.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Будынак Пухавіцкага РАУС дамінуе над горадам.



НАСТАССІЯ ШАМРЭЙ

Маці Валянціна Рыгораўна не сумняваецца, што сына забілі.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Гэты дом Валянцін Доўнар збудаваў сваімі рукамі.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Супрацоўнікі мясцовага КДБ паабяцалі родным сваё расследаванне.

га ў сваім жыцці не пакрыўдзіў. Ніхто ніколі не назіраў не тое што агрэсіі з ягонага боку — ён быў абсалютна неканфліктны чалавек. Сам Валянцін быў не геркулесавага складу. Каб адабраць у яго мабільнік ці яшчэ нешта? У яго ніякіх каштоўнасцяў не было. Цяжка ўявіць, што яго маглі абрабаваць дзеля нейкіх каштоўнасцяў», — зазначае кіраўнік мар’інагорскай суполкі БНФ Кастусь Шпунтоў.

У справе смерці Валянціна Доўнара па-ранейшаму больш пытанняў, чым адказаў. Як чалавек мог праляжаць на самым відным месцы ў горадзе некалькі гадзін і ніхто яго не заўважыў? Чаму міліцыя кажа, што Доўнар быў п’яны, калі гэты чалавек непітушчы? Дзе дзеліся тыя газеты, што вёз з сабой з Мінска Доўнар? Чаму не быў зафіксаваны выклік у «хуткай дапамоге»?

Смерць Доўнара выглядае падазронай. Пра выпадак з ім стала вядома толькі таму, што ён быў сябрам апазіцыйнай партыі. А колькі можа быць падобных выпадкаў па краіне, пра якія ніхто не чуў?

**Зміцер Панкавец, Мар’іна Горка — Мінск**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Доўнар працаваў у «Белдзяржстраху». З працы на пахаванне прыехаў цэлы аўтобус. «Я ніколі яго не бачыла п’яным, ніколі. Гэта поўная хлусня, што ён быў п’яным», — упэўненая калега па працы.



Юлія Дарашкевіч

Мы жывём так, як нам хочацца і як нам цікава.

# Іх рэцэпт шчасця

Пра адну беларускую сям'ю піша **Наталка Бабіна**.

Напачатку хацелася напісаць зусім пра іншае. Пра грамадскую значнасць выступаў Паэтычнага тэатра «Арт. С». Але калі пазнаёмілася з маленькай Альжбетай і пакаштавала салату «Альжбета — гэта лета», напісалася зусім пра іншае...

Але пра ўсё па парадку.

Ёсць у Мінску такая цікавая суполка — Паэтычны тэатр «Арт. С». Паэты, барды, музыкі на грамадскіх пачатках, без ніякага бюджэту, ладзяць літаратурна-музычныя імпрэзы ў бібліятэках і музеях краіны. Галоўная ж пляцоўка тэатра месціцца ва ўтульнай зале бібліятэкі імя Цёткі ў Мінску. Публіка на выступы збіраецца розная. Людзям падабаецца.

Актыўныя ўдзельнікі гэтай творчай суполкі — сямейная пара Аксана Спрынчан і Яраш Малішэўскі.

## Аксана

Аксана родам з літаратурнай сям'і: дзед — Браніслаў Спрынчан, бацька — Вадзім Спрынчан. І сама яна тонкая і цікавая паэтка, майстра дасціпных фраз, якія вырастаюць з парадаксальных думак. «ЖываЯ, і не ведаю, што пасля коскі яшчэ сказаць пра сябе,/ ЖываЯ — а асноўны працяжнік ставіцца паміж датамі нараджэння і смерці», — гэта з ейнага верша.

## Яраш

Яраш — гісторык, паэт і музыка. Як прафесіянал, ён прасачыў свой радавод да XVI ст. Ягоныя продкі са старажытнага шляхецкага роду атрымлівалі прывілеі ад каралёў Жыгімонта і Яна Казіміра. Ягонага прадзеда-святара з-пад Слуцка расстралялі бальшавікі ў 1930-я. Гэтае веданне заставалася з ім на ўсіх скрыжаваннях лёсу.

У жыцці было шмат заняткаў — ад таксідэрміста да намесніка кіраўніка архіва. Падарожнічаў па Еўропе, спяваў на парыжскіх вуліцах. «За беларускія песні грошай у капялюш кідалі болей!» — з усмешкай успамінае ён тыя далёкія часы. Планаваў застацца там назусім, але адчуў такі прыступ тугі, што вырашыў вярнуцца. Можа, прадчуваў сустрэчу з Аксанай?

«Дзе той шлях жаданы кружляе, што кіруе на твой парог,/ Мо падкажа заўтрашні золак слушны выбар між ста дарог?» — напіша ён потым.

А Аксана ў гэты час працавала рэдактарам у славутым выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя», са скрухай назіраючы, як губляе яно сваю славу. «Кіраўніцтва мне казала: добры рэдактар ведае, чые прозвішчы нельга згадваць у энцыклапедычных артыкулах! А я адказвала: не, калі ласка, напішыце мне поўны спіс такіх асобаў!» — смяецца яна цяпер.

## Спатканне

Пошукі свайго шляху прывялі абаіх на Плошчу ў сакавіку 2006 года, і там іх шляхі сышліся ў адно. Цікава: ужо не першая пара прызнаецца мне, што менавіта там знайшліся дзве палавінкі...

На той час Аксана была замужам. «Я бачыла, што майму былому мужу цяжка зразумець, чаму я размаўляю па-беларуску, чаму іду на Плошчу, — прызнаецца Аксана. — Хаця ён і казаў, што перадачы мне насіць будзе».

## Альжбета

Цяпер галоўнаму ў сям'і Аксаны і Яраша чалавеку — пястунцы Альжбеце — два гадкі і два месяцы. Альжбета — шчабятуха. І мама, і тата гавораць з ёй па-беларуску, то і яна пакуль ведае толькі адну мову. Трэцім яе словам пасля мамы і таты было «дуда», а «папа» ў ейным лексіконе — папугай... Цікава, колькі паводле вынікаў перапісу будзе такіх людзей, што, як Альжбета, ведаюць толькі адну мову — менавіта беларускую?

**Яраш збіраўся застацца ў Францыі. Але адчуў такі прыступ тугі, што вырашыў вярнуцца. Можа, прадчуваў сустрэчу з Аксанай? А ў Аксаны не заладзіўся першы шлюб. Сустрэліся Аксана і Яраш на мітынгу ў 2006 годзе...**

І Аксана, і Яраш заўсёды гавораць па-беларуску. На вуліцы, у бальніцы, у краме, на пошце. Аксана апавядае: «З 1 верасня 2001 года я размаўляю выключна па-беларуску. За гэтыя восем гадоў гутарыла па-расейску толькі два дні — калі была ў Таджыкістане. А пачалося так: я выкладала беларускую мову ў Політэхнічнай акадэміі. І адзін студэнт спытаў троху з'едліва — пасля маёй палымянай прамовы пра мілагучнасць роднай мовы і пра карані продкаў: «А вы, Аксана Вадзімаўна, размаўляеце па-беларуску заўсёды?» Я адчула, што не змагу выкладаць, калі не прагучыць «так». У тую хвіліну рудыментны хвост расійскай адваліўся. І я стала сабой».

## Утульны дом

Яраш працуе ў турыстычных фірмах, якія арганізуюць вандроўкі па Беларусі. Ягоны профіль — гістарычныя мясціны, замкі, маляўнічыя сведкі мінуўшчыны. «Намагаюся праводзіць экскурсіі па-беларуску. Але ведаеце, што мяне непакоіць? Мы ў свой час таксама жылі ў расійскамоўным асяродку, але па-беларуску добра разумелі. Сёння дзеці-школьнікі беларускай не разумеюць. На працягу экскурсіі не-не і чую: « А что означает это слово?»

Здавалася б, у доме такога багемнага людства, як Аксана і Яраш, павінна быць тое, што звычайна далікатна называюць «творчым беспарадкам». А не ж. Тут ідэальна прыбрана, утульна, смачна пахне любістай і кары — Аксана згатавала курыцу. У беззаганным парадку захоўваюцца калекцыі — старажытных абразоў, музычных інструментаў (гэта збірае Яраш, усе інструменты ў дзейным стане, і Яраш умее на іх іграць) і... жабак.

Жабкі — зацікаўленне Аксаны. На некалькіх паліцах шафы яны тут на розны густ. Гліняныя, драўляныя, з тканіны і пластмасы, з золата і шкла. Аксана лічыць жабак сімваламі Беларусі. «Буслы ад нас на паўгода злятаюць, — жартуе яна. — Ды і без жабак яны б тут не пражылі. А беларускія жабкі не могуць жыць у няволі. Толькі ў родных балотах, а беларускія балоты — лёгкія Еўропы. Дый памятаеце пра тую жабку, што біла лапкамі ў збане з малаком, пакуль не збіла масла?»

## Дарагое лецішча

У жывой прыродзе сваіх улюбёнак Аксана можа вывучаць на лецішчы каля знакамітай Лысай Гары, дзе некалі давалі дзялкі пад дачы пісьменнікам. Гэтае месца Аксана вельмі любіць і лічыць, што яно валодае гаючай энергетыкай. Тут у такім жа парадку, як гарадскую кватэру, яна трымае сад і агарод. Вырошчвае адмысловыя кабачкі, на якіх праяўляюцца надпісы «Жыве Беларусь!», і абменьваецца ўраджаем з суседам-пісьменнікам Віктарам Казько.

## Шчасце жыць

Мы пра многае размаўлялі з Ярашам і Аксанай. Але галоўнае, што запомніцца надоўга — гэта абсалютна шчаслівая дзяўчынка-беларусачка Альжбета. І фраза Яраша: «Што б ні было, мы будзем рабіць тое, што трэба, тое, што нам хочацца і што нам цікава. Мы будзем жыць па-беларуску. Мы будзем падтрымліваць агмень беларускасці. Бо калі не мы, тады хто?»

Я пабывала ў гасцях у сям'і, шчасцю якой, мне падалося, перашкаджае толькі адсутнасць машыны, каб вазіць Альжбету ў беларускі садок — найбліжэйшы месціцца на вуліцы Багдановіча, кіламетраў за пяць ад іх Вяснянкі. Але ці гэта такая ўжо вялікая перашкода шчасцю?

# ПОШТА РЭДАКЦЫІ

## Пане Рэдактар «НН»,

**вы не павінны крыўдаваць на Міністэрства інфармацыі за яго папярэджанне. Маразм у гэтай краіне працягвае крэпці.**

Летась я праз Еўрапейскае радыё-тэлебачанне — беларускага і постсавецкага я не слухаю — за паўгода да крызісу пачуў размовы пра яго, і калі ўвосень ён надышоў, для мяне гэта не было нечаканай з'явай. Толькі беларускае начальства пра навіслы над краем крызіс нічога не ведала.

Сёлета ўлетку загаварылі пра эпідэмію грыпу, і ўсе ў Еўропе пачалі рабіць запасы лекаў і папярэджваць насельніцтва. У Беларусі ж была ціш. Пэўне, вырашылі засакрэціць, як і крызіс. У выніку ў нас няма ні Чарнобыля, ні крызісу, ні эпідэміі, ні лекаў. Нічога няма: «Наша родзіна пракрасна і цьвяцёт как макав цвет. Акрамя явленій шчасця, нікаіх яўленій нет!?»

КДБ корміцца са змагання з іншадумствам, чыноўнікі засакрэчваюць навакольную рэальнасць. Суды судзяць за 193.1. Дарма Някляеў шукае людскія рысы ў рэжыме. Акрамя лыча, на ім нічога няма.

І ў Мілінкевіча ні д'ябла не выйдзе. Улада так захапілася анестэзіяй народа, што і сама стала дзераўлянай.

Навідавоку як крах сістэмнай апазіцыі, гэтак і ўлады.

Калі пішаце пра хваробы, трэба таксама згадваць пра значны, не меней за 30–40%, рост цэнаў на лекі.

**Мікалай Бусел, народны чытака, Дуброва (Светлагорскі раён)**

## Націск на націск

**Надта непісьменна ставяць націскі журналісты некаторых станцый і нават акторы.** З гэтай нагоды мовазнаўцу Алесю Каўрусу напісаўся вершык, складзены са словаў з тыповымі памылкамі націску. «Выкладаю крыху завострана, але аб'ектыўна», — піша ён.

Скуль жа гэта ўзялося?
«СабралІся», «сабралОся»…
«ДабралІся» так да слова,
Што яно крычаць гатова.
Мо «адбЫлася» дамова
Весці націску абнову?

Вось «Культура», вось «Сталіца»:
То «шпацЫр», а то «сківІца»…
Ды «палУтара», «каторы» —
Прамаўляюць ледзь не хорам.
(Як жа, людзі, вам не сорам!)

Вы, «Свабода» і «Белсат»,
Лепш пільнуйце моўны сад.
Доўга дома не былі —
Дык не «бАлі», а «балІ»,
Замест «звЯзаны» — «звязАны»,
Адно мове болі, раны.
Блэнды пруць з усіх бакоў,
Не дасць рады й Бушлякоў.

А засмучаны чытальнік…
Той з «гурбЫ» ступіў на «цАлік»,
Зняў «дзягУ», сеў на «крушнЮ»
І, здарожаны, прыснуў.
Потым дома, у «сенцАх»,
Учуў хлеба смачны пах!

**Алесь Каўрус**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by.
Факс: (017) 284-73-29**

# Полацкая святыня ўпрыгожыць падмаскоўны пасёлак мільянераў

**Яе перавозяць туды з Рускага музея Пецярбурга. Беларусь не мае шанцаў на яе вяртанне.**

Міністэрства культуры Расіі прыняло рашэнне аб перадачы абраза XII ст. Полацкай Божай Маці з фондаў Дзяржаўнага Рускага музея ў царкву Аляксандра Неўскага ў катэджавым пасёлку Княжае Возера Маскоўскай вобласці, паведамляе расійскі «Коммерсант».

Распараджэнне падпісанае дырэктарам дэпартамента культурнай спадчыны і выяўленчага мастацтва Мінкульта Расіі Рамазанам Калоевым. Падставай для рашэння стаў ліст патрыярха Кірылы міністру культуры Аляксандру Аўдзееву.

Пра гэты абраз мы пісалі ў «НН» яшчэ ў 1998 годзе ў артыкуле «Скрадзены скарб». Ікону адны навукоўцы датуюць XII ст. і прыпісваюць візантыйскаму майстру. Іншыя — пачаткам XIV ст. і лічаць, што яе напісаў полацкі майстар.

Паводле пашыранай версіі, абраз Багародзіцы Эфескай прыдбала ў Канстанцінопалі Еўфрасіння Полацкая для царквы Багародзіцы ў Полацку. Яна паслала па ікону да візантыйскага імператара Мануіла Комніна слугу з каштоўнымі дарамі. Патрыярх Канстанцінопальскі Лука блаславіў прывезены з Ерусаліма абраз у Сафійскім саборы. Слуга Еўфрасінні, Міхал, даставіў абраз у Полацк. У Беларусі яе сталі зваць Адзігітрыяй Полацкай, Пуцяводнай. Паводле легенды, менавіта гэтым абразом дабраславілі шлюб Аляксандра Неўскага і полацкай князёўны Параскевы ў 1239 г.

З моманту захопу Полацка войскамі Івана Жахлівага ў 1579 г. абраз знікае з Беларусі. Маці Божая Полацкая з'яўляецца ў XVII ст. у саборы горада Тарапец. Таму ікону называюць яшчэ «Тарапецкай», у дадатак да старых назваў «Эфеская», «Корсунская». У 1920-я сабор быў зачынены, а ікона апынулася ў тамтэйшым краязнаўчым музеі. У 1930 годзе абраз перадалі на захаванне ў Дзяржаўны Рускі музей.

Маці Божая Адзігітрыя Полацкая — адзін з самых старажытных абразоў у свеце. Рэстаўратары, якіх цытуе «Коммерсант», б'юць трывогу: яе «грунт хрупкі, яго сувязь з фарбавым слоем і паволокай аслабленая». Гэта значыць, што абраз у любы момант можа асыпацца. Таму ў Рускім музеі ікону нават не паказваюць у экспазіцыі. Любое перамяшчэнне святыні можа стаць драматычным яе канцом.



А што лучыць Маці Божую Полацкую з элітнай падмаскоўнай нерухомасцю? Прэзідэнт будаўнічай кампаніі «Сапсан», якая збудавала пасёлак Княжае возера, і фундатар сабора ў Тарапцы, дзе калісь знаходзілася ікона, — адзін і той жа чалавек. Сяргей Шмакаў — праваслаўны бізнэсовец, бацька шасці дзяцей, заснавальнік дабрачыннага фонду «Іванава справа».

У Княжым Возеры на тэрыторыі ў 160 га размешчана 720 зямельных участкаў плошчай ад 15 да 45 сотак кожны. Плошча катэджаў — ад 160 кв. м да 800 кв. м, цана — ад $820 тыс. да $5,5 млн.

Канчатковае рашэнне — за Дзяржаўным Рускім музеем. Гісторыя гэтая ілюструе складаныя ўзаемаадносіны бізнэсу і царквы ў Расіі.

Асвячэнне царквы Аляксандра Неўскага з прыдзелам у імя іконы Полацкай Божай Маці павінна адбыцца 5 снежня. Шанцы на яе выратаванне ад перадачы ёсць, калі працэдура пойдзе легітымным шляхам: праз рэстаўрацыйную і фондава-закупачную нарады, як гэта прынята ў Рускім музеі.

А вось шанцаў на вяртанне гэтага святога абраза ў Беларусь на сёння, бадай, няма. Гэта не адзіная нацыянальная каштоўнасць, страчаная амаль незваротна. Крыж Еўфрасінні Полацкай, а таксама творы Леанарда, ван Дэйка, Розы з калекцый беларускіх магнатаў таксама былі вывезены з Беларусі, толькі пазней, у XIX—XX стст.

**Сяргей Харэўскі**

## ВКЛ у Купалаўскім

24 лістапада на сцэне Купалаўскага тэатра прэзентавалі «Кнігу Вялікага Княства Літоўскага». «Кніга ВКЛ» — манументальнае выданне на чатырох мовах: англійскай, беларускай, літоўскай, польскай — складзена з эсэ публіцыстаў, гісторыкаў і навукоўцаў, кожны з якіх мае свой уласны погляд на гісторыю ВКЛ у кантэксце сённяшняга часу. З выданнем працавалі мастакі Анджэй Струміла і Зміцер Герасімовіч. Сярод беларускіх аўтараў — Уладзімір Арлоў, Сяргей Дубавец, Алег Латышонак, Генадзь Сагановіч і Сакрат Яновіч.




## Тамара Лісіцкая гатовая перакладаць свае кнігі на беларускую мову

Выдавецтва «Рэгістр» прэзентавала свой новы праект выдання кніг сучасных беларускіх пісьменнікаў. Ужо пабачылі свет містычны дэтэктыў Сяргея Клімковіча «Цяжкія часы», гарадскі раман Тамары Лісіцкай «Ідыёткі», зборнік славянскага фэнтэзі Вольгі Грамыка, Нікі Батхан і Леры Сом «Грані».

Усе кнігі выйшлі па-расійску. Як адзначыў страшыня рады дырэктароў групы кампаній «Рэгістр» Андрэй Карпунін, атрымаць у Міністэрстве інфармацыі ліцэнзію на выданне беларускамоўнай літаратуры не так і проста. Але ён не выключае, што ў іх выдавецтве з'явяцца беларускамоўныя кніжкі.



Тамара Лісіцкая заўважыла, што «сумны факт, калі ацэнка якасці літаратуры адбываецца па моўным прынцыпе. Нешта ў гэтым ёсць. Але не гэта адзінае. Мы такое страчанае пакаленне. Я ўжо не перавучуся пісаць па-беларуску».

Але пісьменніца гатова перакласці свае кнігі на беларускую мову, калі гэта спатрэбіцца.

**Кастусь Матушыч, фота аўтара**

БІБЛІЯТЭКА

## Йопыты двух маладых нелюдзяў, цiраж — нікакой




**Сірожка Пістончык, Уласік Смаркач. Йопыты двух маладых нелюдзяў.** (Серыя «Яжысьціка»). Выд-ва «Плюшч», 205 с., Цiраж — нікакой.

(Бела)рускай мовы няма, цэнзура курчыцца ў перадсмяротных канвульсіях, і цьмяным 00-ым (гэтаксама як калісь праклятым 1990-ым) хутка прыйдзе лагічны харакіры. Аднак панк паранейшаму is not dead. Ён падрос, адпусціў бараду і акуляры, і, агледзеўшыся навокал на прадмет халяўных бычкоў, паказаў свету ўдасканаленую версію сваёй камбінацыі з трох пальцаў. Бальшушчы апалагет трасянкі Сірошкі Пістончыка самвыдатаўскім спосабам зрабіў кніжачку сваіх камедных прыпавесцяў: случаі з жызні, дзідзіцючыя расказы, кашмарыкі і другія развлікацельныя жанры.

З самых глыбіняў Мордару 1990-х вырваўся крык тых, хто заўчасна аддаў сваю цнатлівую маладосць падваротням, п'яным дварам і блатхатам. Крык — з пераграм, а таму чытачам ёсць небяспека смеючыся атруціцца духам тых часоў.

Слухайце ў крыку:

— Як памруць айчынныя пісьменнікі? (Пайменны спіс).

— Які лёс напаткаў Віні-Пуха і спадарыню Беладонну?

— Што лепей, «бажэсцвенная ўлага», вінчык, ці ж «амброзія для смертных», кахвіёк?

— Як ставіцца да жывёлаў працаўніца кілбаснага цэха, рубшчыца вышэйшай катэгорыі Васільеўна?

Дзякуючы нецэнзурычне, вынікі «Йопытаў двух маладых нелюдзяў» аднаначна не агалосяць праз легальны кніжны распаўсюд.

**Лявон К.**

СЦІСЛА

### Памёр пісьменнік Мілорад Павіч

Знакаміты сербскі пісьменнік Мілорад Павіч памёр у 80 гадоў.

Па адукацыі ён быў філосафам. Перад тым як цалкам прысвяціць сябе пісанню, Павіч выкладаў ва ўніверсітэтах (Сарбона, Вена, Фрайбург, Рэгенсбург і Белград).

Сусветную вядомасць Павічу прынёс раман «Хазарскі слоўнік» (1984).

Пры гэтым Павіч працаваў у газетах, пісаў крытычныя нататкі, манаграфіі па гісторыі старажытнай сербскай літаратуры і паэзіі сімвалізму, перакладаў вершы з еўрапейскіх моваў.

Урывак з ягонага «Хазарскага слоўніка» «НН» друкавала ў 1993 годзе. Гэта быў напраўдзе адзін з вялікіх пісьменнікаў сучаснасці.

**МБ**

# У Чэхіі рэвалюцыю зрабілі студэнты

**17 лістапада споўнілася 20 гадоў, як у Чэхаславакіі абрынуўся камуністычны рэжым. Піша Алесь Пілецкі.**

20 гадоў таму ніхто ў Чэхаславакіі не мог сабе ўявіць, што не за гарамі вялікія перамены. Адам Міхнік — у тыя часы дзеяч польскай «Салідарнасці», а сёння шэф-рэдактар папулярнай у Польшчы Gazety Wyborczej — любіць распавядаць пра сваю гутарку з Вацлавам Гаўлам, што адбылася незадоўга да чэшскага лістапада 1989-га. Тады Міхнік, поўны аптымізму, спрабаваў узбадзёрыць невялічкую групу чэшскіх дысідэнтаў, сцвярджаючы напаўсур'ёзна, што ўжо да канца года ўлада ў краіне зменіцца, а Вацлаў Гавал напэўна стане першым дэмакратычным прэзідэнтам краіны. З пана Міхніка тады пасмяяліся не толькі ў Празе, але і ў Варшаве. Аднак у снежні 1989-га смяяўся ўжо Міхнік. Яго прагноз бліскуча спраўдзіўся.

Чэшская апазіцыя насамрэч была слабай. Хоць дысідэнты і былі добра падрыхтаваныя да зменаў — мелі распрацаваную праграму рэформаў. Паверыць ў хуткія перамены яны не маглі нават пасля краху берлінскага мура і перамог польскай «Салідарнасці».

Кіраўніцтва чэхаславацкай кампартыі выводзілася пераважна са старых брэжнеўскіх колаў і з недаверам ставілася нават да гарбачоўскай перабудовы. Палітычная апазіцыя ў Чэхаславакіі не была разгалінаванай. У 1977-м знакамітую «Хартыю-77», якая патрабавала ад камуністаў толькі выканання іх жа ўласных законаў, падпісала толькі 244 чалавекі. Гэта ў Чэхаславакіі, якая тады налічвала больш за 15 млн насельніцтва.

Сотні палітычных вязняў, адсутнасць мінімальных свабод, закасцянелы партыйны апарат... Восенню 1989-га года толькі невялікая група пражскіх студэнтаў рэгулярна выходзіла на вуліцы, патрабуючы пераменаў. Дысідэнты на чале з Вацлавам Гаўлам не маглі сабраць на вуліцах дастатковую колькасць прыхільнікаў. Яны чакалі зменаў, не асабліва ўмешваючыся ў ход падзей.

Адно з такіх студэнцкіх выступленняў і стала нечаканай для ўсіх пачаткам перамен. 17 лістапада студэнты Карлавага ўніверсітэта ладзілі дэманстрацыю, прысвечаную памяці забітага ў 1939-м нямецкімі акупантамі Яна Оплетала. Не задаволіўшыся адведзеным ім месцам у студэнцкім раёне Альбертаў, дэманстранты скіраваліся ў цэнтр горада, дзе былі жорстка сустрэтыя спецслужбамі і міліцыяй.

Пасля разгону дэманстрацыі па горадзе і краіне пайшлі чуткі аб ахвярах. Пазней яны будуць абвергнутыя, аднак хваля незадаволенасці жорсткасцю ўладаў пачала нарастаць. Студэнты па ўсёй краіне абвяшчаюць страйк і заклікаюць людзей выходзіць на вуліцы гарадоў. Першымі на заклік адгукнуліся акцёры тэатраў. Яны разам са студэнтамі пачалі ездзіць па краіне і проста хадзіць ад дзвярэй да дзвярэй, расказваючы аб падзеях 17 лістапада. Ва ўмовах адсутнасці вольнай прэсы і тэлебачання ды недаверу да афіцыйнай інфармацыі гэта дало ашаламляльны эфект. Ужо праз некалькі дзён на вуліцы Прагі выйшла каля 250 тысяч чалавек.

Запалохаць такую колькасць людзей маглі толькі савецкія танкі. Але на вуліцы быў 1989-ы, а не 1968-ы...

29 лістапада парламент краіны адмяніў артыкул Канстытуцыі аб кіроўнай ролі камуністычнай партыі.




**Дэманстрацыя ў Празе 17 лістапада 2009 г. на 20-ю гадавіну Аксамітнай рэвалюцыі. Надпіс на транспаранце — «Дзякуем усім, хто не скарыўся».**

А праз месяц прэзідэнтам ужо быў Вацлаў Гавал. Уновы, 1990-ы, Чэхаславакія ўступіла новай краінай. Змена дзяржаўнага ладу працягвалася трохі больш за месяц.

У 2009-м ужо не існуе Чэхаславакіі. Вырасла пакаленне, для якога камунізм атаясамляецца з падручнікамі па гісторыі. Шмат што з тых далёкіх апошніх гадоў камунізму змянілася і забылася. Аднак шмат застаецца і сёння актуальным. Вацлаў Гавал, адзіны з лідэраў антыкамуністычных рухаў у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, знаходзіцца на вяршыні чэшскай палітычнай эліты. Студэнты Карлавага ўніверсітэта стварылі спецыяльную арганізацыю для назірання за чэшскай дэмакратыяй і не даюць спакою палітыкам, высоўваючы палітычныя патрабаванні.

На дэманстрацыі, што прайшла ў Празе 17 лістапада гэтага года ў памяць аб падзеях дваццацігадовай даўніны, патрабаваннямі адстаўкі цяперашняга прэзідэнта Чэхіі — Вацлава Клаўса — было не менш, чым антыкамуністычных лозунгаў у 1989-м.

Не менш было і ўдзельнікаў. Збольшага маладых, якія не памятаюць бурлівага канца 1980-х. Але для іх шлях са студэнцкага Альбертава ў цэнтральную частку горада з нізкай ключоў у руцэ (звонам ключоў дэманстранты ў 1989-м прыцягвалі ўвагу пражан) — гэта сімвал свабоды і дэмакратыі. Хай сабе сёння можна пачуць, быццам антыкамуністычныя дэманстрацыі былі спланаваныя спецслужбамі, а некаторыя з камуністычных кіраўнікоў знайшлі сябе ў бізнэсе і сёння маюць значны ўплыў у краіне. Можна пачуць таксама, што вырашальную ролю ў чэшскай рэвалюцыі адыгралі знешнія фактары. Гэта не мае ніякага значэння. Чэшская студэнцкая рэвалюцыя адбылася і за месяц цалкам змяніла краіну. І калі тое будзе неабходна, адбудзецца ізноў.

*Прага—Мінск*

**Шыман Панк: Мы толькі паскорылі працэс**

«Мы, як студэнты, прымалі тады актыўны ўдзел у дэманстацыях. Дэманстрацыі пратэсту адбываліся на працягу 2—3 месяцаў. Звычайна на іх прыходзіла 2—3 тысячы чалавек. Максімум 5 тысяч. І гэта шмат, бо яшчэ за пару месяцаў да таго, летам 1989–га, усяго прыкладна 40 чалавек былі пастаяннымі ўдзельнікамі студэнцкага дысідэнцкага руху.

Мы хацелі мабілізаваць краіну на патрабаванне пераменаў. Найцяжэй было распаўсюдзіць інфармацыю аб нашых патрабаваннях.

Акцыя 17 лістапада была дазволена ўладамі. Гэта памятны дзень для ўсіх чэхаў, магчыма таму прыйшло амаль 30 тысяч чалавек. Пераважна студэнты — дысідэнты на чале з Вацлавам Гаўлам не ўмешваліся ў нашыя справы. Дэманстрацыя была дазволена толькі ў раёне Прага–2, аднак студэнты вырашылі скіравацца ў цэнтр горада, дзе былі вельмі жорстка сустрэтыя паліцыяй. 500 чалавек трапілі ў шпіталі. Па горадзе пайшла пагалоска: «Яны б'юць нашых дзяцей». На наступны дзень пасля дэманстрацыі пачалася студэнцкая забастоўка. Мы раздзялілі краіну на раёны — кожнаму факультэту свой — і пачалі ездзіць туды і расказваць аб падзеях 17 лістапада. Праз 2–3 дні ўся краіна ведала, што насамрэч адбылося.

Мы высунулі патрабаванні да ўладаў — растлумачыць прычыны разгону мірнай дэманстрацыі, надаць акадэмічныя свабоды ўніверсітэтам, адмяніць 4–ы артыкул Канстытуцыі аб верхавенстве кампартыі.

Увогуле, камуністычны рэжым пачаў распадацца пасля прыходу да ўлады Гарбачова ў Маскве. Мы толькі паскорылі працэс. Узялі яго пад свой кантроль. Камунізм быў ужо пустым — адсутнічала падтрымка Крамля, ніхто яму не верыў — нават самі камуністы».

***Шыман Панк***

*адзін з арганізатараў студэнцкіх дэманстрацый у канцы 1980–х, сёння — дырэктар сусветна вядомай чэшскай недзяржаўнай арганізацыі «Чалавек у нядолі»*

**Карэл Шварцэнберг: Цэлыя пакаленні выраслі ў несвабодным грамадстве**

«Адразу пасля рэвалюцыі вялікай часткі чэшскага грамадства было складана прыстасавацца да новых умоваў. Старыя галіны прамысловасці пачалі адміраць. Цэнтральнае кіраванне эканомікай трэба было скасоўваць, уводзіць вольны рынак, пераарыентоўваць гаспадарку на Захад. У Заходняй Еўропе пераход са старой мадэлі прамысловасці на новую заняў дваццаць гадоў, у нас толькі шэсць. У сельскай гаспадарцы за вельмі кароткі час мы знізілі колькасць людзей, занятых там. Гэта таксама быў вельмі непапулярны крок.

Наша дэмакратыя яшчэ ў стане развіцця. Яна не сфармаваная канчаткова. Перыяд з 1938–га да 1989–га пакінуў след у свядомасці: цэлыя пакаленні выраслі ў несвабодным грамадстве.

У нас адбылося тое ж, што я бачыў у Аўстрыі і Германіі пасля вайны — адразу пасля падзення рэжыму людзі вельмі цікавяцца палітыкай, хочуць разабрацца ў ходзе падзей. У нас так было на пачатку 1990–х.

Пазней больш важнымі сталі пытанні паўсядзённага жыцця. Аднак сёння я бачу абуджэнне цікавасці да палітыкі сярод моладзі. Гэта вынік незадаволенасці сённяшняй невясёлай сітуацыяй ў Чэхіі. Таму я чакаю, што да моладзі вернецца пачуццё адказнасці за краіну і тое прывядзе да перамен. Як у 1989–м».

***Карэл Шварцэнберг***

*былы міністр замежных справаў Чэшскай Рэспублікі*

**Петрушка Шустрава: Камуністы прывучылі людзей хлусіць**

Пасля акупацыі Чэхаславакіі ў 1968–м войскамі Варшаўскай дамовы чэхаславацкі рэжым нават не спрабаваў прымусіць людзей яму верыць. Камуністам патрэбны быў толькі выгляд нармальнасці. Трэба было хадзіць на парады, правільна адказваць у школе на пытанні аб камуністычнай уладзе. Людзі былі вымушаныя хлусіць. І гэта вельмі дрэнна, таму што людзі прывыклі да такіх паводзінаў. Нават цяпер, пасля 20 гадоў дэмакратыі, для іх шчырасць і праўда — не зусім нармальныя рэчы.

Людзі звыклі да таго, што ўрад і ўлада больш важныя, чым звычайны грамадзянін.

Сёння ў Чэхіі шмат хто сімпатызуе камуністам. Нехта згадвае маладосць, што прайшла ў сацыялізме, нехта так і не змог адаптавацца да новых умоваў. Старыя людзі непакояцца аб сваім дабрабыце. Гэта можна зразумець. Сітуацыя няпростая. Аднак ад голаду ніхто не памірае. Пры камуністах таксама не было лёгка. Моладзь, якая падтрымлівае камуністаў і жадае вярнуць стары рэжым, проста нічога пра яго не ведае.

***Петрушка Шустрава***

*чэшская дысідэнтка, былая намесніца міністра ўнутраных справаў, адна з аўтараў Закона аб люстрацыі.*

**Гутарыў Алесь Пілецкі**

# Гэта Румынія

**Аўтабан сканчаецца тупіком, каля ног паўсюдныя бадзяжныя сабакі, эмоцыі цераз край... Вы ж хацелі прыгод!**

Кантыненты трэба мераць самалётамі, краіны — машынамі, а гарады — нагамі. Праз шкло машыны ты не ўбачыш усю краіну і не зразумееш яе да канца, але будзеш мець асабістае ўяўленне аб ёй, часта адрознае ад таго, што прапануюць тэлебачанне і газеты.

Румынія майго падарожжа не падобная на тое, што я ведала пра яе раней. Праехаўшы праз усю Румынію, я не ўбачыла ніводнай цыганскай кібіткі. Затое бачыла п’янага цыгана, якога жонка вяла пад ручкі дадому. Гумавыя боты, хустка і муж, які адначасова сварыцца і спявае, быццам у нашай вёсцы... І толькі ў рэстаране гатэля у адзін з вечароў — цыганскія яркія сукенкі, спевы і танцы. Выступаў фальклорны калектыў. Румынскія цыганы — такая ж казка, як мядзведзі, што ходзяць па Маскве.

Што кідаецца у вочы — гэта тэмпы будаўніцтва і развіцця краіны. За тры гады, што прайшлі між першым і другім маімі падарожжамі туды, пустыя тэрыторыі ўздоўж узбярэжжа запоўніліся гатэлямі і турыстамі. Цэнтральныя вуліцы гарадоў радуюць вока кветнікамі, адрамантаванымі фасадамі і чысцінёй.

Аднак варта звярнуць з цэнтральных вуліц, і вам адкрыецца другая Румынія... Асабліва ў гэтым сэнсе ўражвае Бухарэст.

### Бухарэст

Мы прыехалі ў другой палове дня. Машыну прыпаркавалі, як толькі заехалі ў горад. Вырашылі падарожнічаць грамадскім транспартам. Зайшлі ў бліжэйшую кнігарню купіць карту горада. Вітаемся па-румынску: «Бона зіва». Спрабуем на пальцах растлумачыць, што нам трэба. Прадавец прапануе: «Гаварыце па-расійску». Працаваў па кантракце ва Украіне, там і навучыўся. Мужчына распытваў пра жыццё ў Беларусі, жаліўся, што ў іх з жонкай малыя зарплаты. У яго — 250 еўра, у жонкі — 500. Новы знаёмы алоўкам на карце пазначыў цікавыя аб’екты, растлумачыў, як даехаць да цэнтра, паказаў найбліжэйшы гатэль. Вялікі яму «мульцымеск» (дзякуй па-румынску).

Бухарэст — прыязны горад. Жыхары стараюцца дапамагчы і выглядаюць крыху здзіўленымі. Відаць, замежныя турысты не частыя ў іх госці. А вось турыстычнымі аўтобусамі з самой Румыніі запоўненая ўся паркоўка ля цэнтральнай плошчы.

Вуліца Каля Вікторый, дзе знаходзяцца галоўныя турыстычныя аб’екты, спакойная, транспарту мала. Гуляеш, глядзіш пампезныя будынкі. Сыходзіш з адшліфаванай турыстычнай зоны ў завулак і... Перакапаная вуліца без грама асфальту.Каб па ёй рухацца, абапал зробленыя насцілы з дошак на слупах шырынёй метр. Пасярод вуліцы перыядычна з’яўляюцца дашчаныя падмосткі з адкрытымі кавярнямі.

Элітныя крамы-салоны чаргуюцца з напаўразбуранымі дамамі-звалкамі. А ў летніх «кавярнях на дошках» поўна добра апранутага народу. Гламур па-румынску. Ідзем далей. Вузкі праход ва ўнутраны дворык — і быццам трапляем у старую Румынію. Трохпавярховы дом з праламаным дахам, расчыненыя вокны, з якіх у двор цягнуцца вяроўкі з бялізнай. Вокны напалову забітыя фанерай. З-пад дома цячэ брудная вада, і худыя каты рыюцца на сметніку... Можа, апошні раз бачылі мы такі непрычасаны Бухарэст. Гледзячы на тое, як хутка аднаўляецца і адбудоўваецца цэнтр.

Асабліва радуе, што дамы не зносяць, іх проста рамантуюць, захоўваюць фасады, паднаўляюць ляпніну.

### Аўтабан сканчаецца тупіком

Раніцай накіроўваемся ў бок мора. Можна ехаць праз Урзічэні старой дарогай, а можна новай аўтастрадай. Турыста-аўтамабіліста цягне на аўтастраду, і гэта будзе памылкай.

Даехаць да яе праблема з-за блытаніны з указальнікамі, ды кальцавая дарога, па якой прыйдзецца ехаць да аўтастрады, нічога падобнага да мінскай кальцавой не мае. Ваенна-грузінская дарога Бухарэста. А калі вы ўжо шчаслівы будзеце ляцець па аўтабане, праз сто кіламетраў ваша шчасце скончыцца разам з аўтабанам. Тупік. Усе з’язджаюць на вузенькую дарогу. Як толькі залезеце ў гэту аўтамабільную кашу, кальцавая горада Бухарэста падасца вам шыкоўнай. Гэта Румынія. Галоўнае не злавацца. Вы хацелі прыгод? Вы іх атрымалі.

А яшчэ Румынія — гэта краіна «свяшчэнных» сабак. Яны тут паўсюль: бегаюць каля ног на запраўках, зазіраюць у вочы ў прыдарожных кавярнях. Іх застылыя трупікі ляжаць на ўзбочынах. У невялікіх гарадках можна назіраць карціну: камунальнікі сабралі ў купу лісце, галлё, смецце, а зверху прыцiснулі сабачым трупікам. Спачатку гэта выклікае шок, пасля прывыкаеш. Уздоўж дарог шмат прыватных дамоў. Гаспадары трымаюць сабак. Вось і вынік.

### Пляжны алімп

Пераадолеўшы дарогу, апынаемся ў курортнай зоне. Спачатку на пяць дзён спыняемся у гатэлі курорта Алімп. Пражыўшы пару дзён, зразумелі, што харчавацца лепш у гатэлі. Кавярні ў курортнай зоне дарагія. А вось гатэлямі курорт не перагружаны. Пляжы свабодныя. У гатэлі на рэцэпцыі маладыя румынскія дзяўчаты, крыху фанабэрыстыя. Паводзіны папахваюць сацыялізмам. Гатэлі дзяржаўныя. На работу, відаць, бяруць па знаёмстве.

Самі ж гатэлі выглядаюць прыстойна. Дзяржава зацікаўленая зарабляць на турызме.

Тут жа, на курорце, знаходзіцца гразелячэбніца. Па ўзбярэжжы прадаюцца бутэлькі з лячэбнай граззю. Людзі абмазваюцца гэтым чорным эліксірам з галавы да ног. Сярод бледнатварых турыстаў трапляюцца гэтакія афрыканцы, толькі вочы бліщчаць і белазубыя ўсмешкі. Ужо будуць здаровенькія.

На другі дзень нашага прыезду, заўважыўшы машыну з беларускімі нумарамі, падышоў малады чалавек: «Вы з Мінска? Я — таксама! Дванаццаты дзень мучаюся. Жонка прыгаварыла на чатырнаццаць дзён». Пазайздросціў, што мы на колах і можам паездзіць па розных месцах. Так і здарылася. Праз пяць дзён мы пераехалі.

### Лядоўні для тэмпераментных

Мястэчка называецца Эйфарыя-норд. Тут жыццё віруе. Адпачываюць у асноўным румыны. Усё дэмакратычна, можна зняць нумар у дарагім гатэлі, а можна і сціплы пакой. У пашане вілы: прыватныя дамы з дзесяткам нумароў, якія гаспадары здаюць у арэнду. Мы выбралі гэты варыянт. Можна пажыць сярод румынаў, паназіраць. У пакоі стандартны набор выгод: санвузел, балкон, тэлевізар. А дзе ж лядоўня? Аказваецца, у прасторным холе каля пакоя. Там жа стаіць некалькі сталоў. Румыны вечарамі любяць выходзіць у хол. Складаецца сумесная вячэра, і тут усё пад рукой: сталы і лядоўні з выпіўкай і закускай. А ты ляжыш у ложку, пазіраеш на дзверы і чакаеш, калі яны ўгаманяцца.

Тэмпераменту ў румынаў значна больш, чым у беларусаў. Мы ўпэўніліся ў гэтым, калі на наступны дзень убачылі , што любімая статуэтка нашай гаспадыні, умураваная ў слуп каля лесвіцы, вырвана з коранем. А гаспадыня з сумнымі вачыма пыталася, ці шмат беларусаў адпачывае ў гарадку.

### Украіна з некалькіх вёсак

У адзін са звычайных пляжных дзён мы заўважылі, што за намі назірае румынская сямейная пара. Памахаўшы нам ручкай, мужчына падышоў бліжэй, каб даведацца, адкуль мы прыехалі, і радасна паведаміў, што ў яго ёсць friend з Украіны Аляксандр. Мы зразумелі, што гэты Аляксандр сёння прыйдзе на пляж. І вось да нас набліжаецца сямейная пара. Мужчына з чорнымі валасамі і гарбатым арлiным носам. Няўжо гэта Аляксандр? Жанчына светлавалосая, невысокага росту, з кірпатым носікам, цалкам можа быць украінкаю. Так яно і апынулася. Не Аляксандр, а Аляксандра. Яна падсела да нас. Калі мы спыталі, з якога ўкраінскага места яна прыехала, то былі шакаваны адказам:

— З Краснадарскага краю.

— Дык гэта ж Расія?!

— Цяпер, можа, і Расія. А калі нашы продкі яшчэ за першым царом адтуль уцякалі, то была Украіна.

Продкі Аляксандры ўжо тры ста гадоў жывуць у Румыніі ў сваім краснадарска-ўкраінскім асяроддзі, якое складаецца з некалькіх вёсак. Людзі захоўваюць мову, традыцыі, жэняцца толькі між сваімі. Святары не даюць кроку ўбок ступіць, каб не здрадзіць веры. І толькі апошнім часам моладзь пачала пратэставаць. Самой Аляксандры ўдалося выйсці замуж за румына, якога пакахала. Бацькі не ўпіраліся, бо хацелі дачцэ шчасця. З царкоўнымі прыйшлося пазмагацца. Яна хацела ісці замуж у сучаснай вясельнай сукенцы, а не ў старадаўніх строях. Бацькі плакалі, казалі, што поп забараняе белую вясельную сукенку... Аляксандра актыўная, эмацыйная, падобная на ўкраінскую жанчыну. Проста здзіўляешся, як у дыяспары трыста гадоў могуць захоўваць адметныя нацыянальныя рысы?

Дні адпачынку праляцелі хутка. Настрой быў добры. І нават калі ўвечары з нашай лядоўні скралі пару бутэлек піва, мужа гэта не разззлавала. Падазрэнне ўпала на мужа гаспадыні, бо на наступны дзень ён быў падкрэслена ветлівы і махаў нам ручкай.

Нашымі паводзінамі гаспадыня засталася цалкам задаволеная, нават не прыйшла правяраць нумар. Проста сказала пакінуць ключы на стале.

На досвітку мы пакінулі гасцінную вілу гарадка Эйфарыя-норд. Дарагія румыны, з вамі было цікава. Усяго вам найлепшага. Па дарозе ў Беларусь мы накупілі ў мясцовых сялян дынь і кавуноў. Каштуюць капейкі і маюць добры смак.

**Зоя С., Мінск**













# 10-годдзе «J:морс»

У снежні гурту «J:морс» стукне 10 гадоў. Адзначыць гэтую дату музыканты вырашылі эксклюзіўнай праграмай «Канцэрт у тэатры — сеанс з выкрыццём», якую калектыў прадставіць 8 снежня ў Купалаўскім тэатры. Падчас выступу прагучаць хіты і песні, якія даўно не выконваліся на публіцы. Пачатак а 19-й.

PHOTO.BYMEDIA.NET

## КАНЦЭРТЫ

**Канцэрт Віктара Шалкевіча**

**11 снежня ў Палацы культуры ветэранаў (вул. Янкі Купалы, 21)** бард Віктар Шалкевіч выступае з праграмай «Лепшае і новае». **Пачатак а 19-й.**

**IQ48 у «Добрых мыслях»**

**12 снежня ў Фальварку «Добрыя мыслі» (вул. Магілёўская, 12)** рок-гурт IQ48 сыграе «Самы душэўны канцэрт». Такім чынам музыкі прэзентуюць выхад свайго першага DVD — «Зрабі сам. Акустыка.».

**Будзьма беларусамі**

Святочны канцэрт ад «Будзьма беларусамі!» адбудзецца **7 снежня ў будынку Тэатра беларускай драматургіі (вул. Крапоткіна, 44). Пачатак а 19-й.** Усе запрашальнікі застаюцца ў сіле.

**Флэшквартэт**

**17 снежня а 19-й у Вялікай зале Белдзяржфілармоніі** пачнецца канцэрт з нагоды шведскага нацыянальнага свята Люсіі і заканчэння тэрміну шведскага старшынства ў Еўрапейскім Саюзе. «Флэшквартэт» — легендарны шведскі струнны ансамбль, музычны стыль якога дакладна можна апісаць як «ф'южн», бо ён вар'юецца ад вытанчанага выканання класікі і джазу да эксперыментальнага року.

## ІМПРЭЗЫ

**Беларускую кнігу — дзецям**

**У чацвер (3 снежня)** у межах кампаніі «Беларускую кнігу — дзецям» **на сядзібе БНФ (пр. Машэрава, 8)** адбудзецца дабрачынны канцэрт. Сярод выступоўцаў — барды **Аляксандр Мельнікаў, Міхал Бараноўскі,** гурт **«Скрыжалі».** Уваход на канцэрт вольны, але пажадана, каб кожны наведнік ахвяраваў хаця б адну кніжку на беларускай мове для дзіцячых дамоў. **Пачатак а 18-й.**

**Батлейка**

**Да 9 студзеня кожную суботу ў Нацыянальным гістарычным музеі (вул. Маркса, 12)** праводзяцца батлеечныя спектаклі. **Ад 12.00 да 16.00, кожную гадзіну** можна пабачыць традыцыйную калядную пастаноўку «Цар Ірад». Кошт білета для дарослых і дзяцей — 2200 рублёў.

**Кліп-Марафон-2009**

Першая прафесійная інтэрнэт-радыёстанцыя Беларусі NETradio сумесна з творчай ініцыятывай «МАРАфон» аб'яўляюць аб пачатку другой штогадовай прэміі беларускага музычнага відэа «Кліп-Марафон-2009». Першая прэмія прайшла ў мінулым годзе, і па яе выніках пераможцамі сталі кліпы «Тры янгалы» («Тройца»), «Дажджамі» (B.N.), «Падае дождж» («Крама») і «Tanki» (ZIGZAG). Сёлетняя прэмія падвядзе вынікі айчыннага кліпмэйкінгу за 2009 г. Экспертамі былі вылучаныя 7 кліпаў, якія пазмагаюцца паміж сабой за званне найлепшага. Цягам трох тыдняў, ад 1 да 21 снежня, кожны наведвальнік старонкі NETradio зможа прагаласаваць раз на дзень за ўлюбёнае відэа. Пераможцы прэміі выступяць на канцэртнай частцы прэміі «Кліп-Марафон».



**Belly dance**

**6 снежня ў канцэртнай зале «Мінск» (вул.Кастрычніцкая, 5)** пройдзе фінальны этап чэмпіяната Еўропы па belly dance. **Пачатак а 17-й.**

**Вершаспеў «Дівчина з легенди»**

Вечарына ўкраінскай паэзіі пройдзе **11 снежня ў бібліятэцы імя Цёткі (вул. Талбухіна, 12а).** Гэта будзе кампазіцыя паводле рамана ў вершах «Маруся Чурай» украінскай паэткі Ліны Кастэнка. **Пачатак у 18.30.**

## ВЫСТАВЫ

**Дзень адкрытых дзвярэй у Музеі народнага мастацтва**

**12 снежня Музей беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах** праводзіць Дзень адкрытых дзвярэй з нагоды свайго 30-годдзя. **Музей працуе ад 10-й да 16.30.**

**У пошуках Атлантыды. Опса**

**У галерэі «Вільня» (вул. Каліноўскага, 55) да 14 снежня** працуе выстава «У пошуках Атлантыды. Опса», зладжаная па выніках пленэру, які праходзіў у вёсцы Опса Браслаўскага раёна. Мэта пленэру — пошук і падтрымка маладых мастакоў.

**Фотавыстава, прысвечаная Дню памяці ахвяраў Галадамора**

**У Гістарычнай майстэрні (вул.Сухая, 25) у Мінску** працуе фотавыстава «Пакараныя голадам: невядомы генацыд украінцаў 1932—1933», прымеркаваная да Дня памяці ахвяраў Галадамора. Экспазіцыя складаецца з 33 стэндаў, на якіх размешчаныя сведчанні відавочцаў Галадамора, фотакопіі дакументаў савецкіх органаў дзяржбяспекі, статыстычныя звесткі і фатаграфіі першай трэці XX стагоддзя.

**Літоўская прэс-фатаграфія**

**У кінатэатры «Цэнтральны» (пр. Незалежнасці, 13), аўтацэнтры Кіа Атлант-М Баравая (Баравая, 2, шоу-рум), «Цэнтры-відэа»** да 22 снежня працуе выстава «Літоўская прэс-фатаграфія».

**Фота 1969—2009**

Фотавыстава Ігара Барсукова «Фатаграфіі 1969–2009 гадоў» працуе **да 20 снежня ў галерэі «Мір Фота» (вул.Прытыцкага, 10).**

**У аб'ектыве — случчане**

**У Доме-музеі I з'езда РСДРП (пр.Незалежнасці, 31а)** працуе выстава фотаздымкаў Ларысы Салодкінай «У аб'ектыве — случчане».

## ТЭАТРЫ

**3 снежня**

**Тэатр імя Горкага** — «Бег»
**Купалаўскі тэатр** — «Хам»
**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сёстры Псіхеі»

**4 снежня**

**Купалаўскі тэатр** — «Хам»
**Тэатр імя Горкага** — «Я твая нявеста»

**5 снежня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адвечная песня»
**Тэатр оперы і балета** — «Папялушка»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»

**6 снежня**

**Тэатр імя Горкага** — «Даходнае месца»
**Тэатр оперы і балета** — «Трубадур»
**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Раман + Юлія»

**7 снежня**

**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Варшаўская мелодыя»
**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»

**8 снежня**

**Тэатр юнага гледача** — «Ліса і вінаград»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»
**Тэатр імя Горкага** — «Сунічная паляна»

**9 снежня**

**Купалаўскі тэатр** — «Памінальная малітва»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Палёты з анёлам»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»
**Тэатр оперы і балета** — «Дзікае паляванне караля Стаха»

**10 снежня**

**Тэатр імя Горкага** — «Сыходзіў муж ад жонкі»
**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з дурнем»
**Тэатр юнага гледача** — «Блíндаж»

**11 снежня**

**Тэатр юнага гледача** — «Дарога на Віфлеем»
**Тэатр оперы і балета** — «Сельскі гонар»
**Тэатр імя Горкага** — «Сыходзіў муж ад жонкі»
**Купалаўскі тэатр** — «С.В.»

**12 снежня**

**Купалаўскі тэатр** — «Вечар»
**Тэатр імя Горкага** — «Ад'ютант-Ша Яго Вялікасці»

**13 снежня**

**Тэатр оперы і балета** — «Чароўная флейта»
**Тэатр юнага гледача** — «Шчаўкунок»
**Купалаўскі тэатр** — «ГендэльБах»
**Тэатр імя Горкага** — «Уяўны хворы»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Містэр Розыгрыш»

## КІНО

# Мапа гукаў Токіа




**Map of the Sounds of Tokyo**

Іспанія — Японія, 2009, каляровы, 109 хв.

**Рэжысёрка:** Ізабэль Кайшэт

**Жанр:** крымінальная меладрама

**Адзнака:** 6 (з 10)

Ціхая японская забойца Ру працуе на начным рыбным рынку, каб не абцяжарваць сябе думкамі. Ёй замаўляюць ліквідаваць Дэвіда, іспанскага гандляра вінамі, якому японскі бізнэсовец не можа дараваць самагубства сваёй дачкі. Прафесійная кілерка бярэцца за справу, але ўмешваюцца пачуцці…

Карціна Ізабэль Кайшэт — інтэрнацыянальная. Сцэны гукааператар збірае шумы Токіа. Сэксуальныя сцэны — флэшмобы чужых пачуццяў. Усе стаміліся: гераіня, якая даядае апошні рысавы піражок, іспанец — харызматычны Сержы Лопеса, стары гукааператар, які невядома чаго чакае.

Але болей за ўсіх стаміўся глядач. Стужка — чарговая напышлівая скарга на духоўную пустэчу, з якой не выводзіць і смерць.

**Андрэй Расінскі**

# Кляштару брыгітак у Гродне — 375 гадоў

25 лістапада (паводле новага летазлічэння) 1634 года ў Гродне маршалак ВКЛ Крыштаф Вясялоўскі і яго жонка Аляксандра заснавалі кляштар брыгітак, помнік архітэктуры ранняга барока. Да канца XVIII стагоддзя тут жа былі ўзведзеныя каменны касцёл, жылы корпус, агароджа з брамай, гаспадарчыя пабудовы, разбіты гарод, сад. Асобна стаяла званіца-капэла, якая існавала да пачатку 1960-х гадоў.

З агароджы комплексу ў выглядзе глухой каменнай сцяны з невялікімі шасціграннымі вежамі па кутах захаваліся толькі дзве. У 1950–1980-я гг. кляштар не дзейнічаў, а ў 1992 г. касцёл ізноў быў асвечаны.

Не кожны жыхар горада звяртае ўвагу на ляпніны, якой аформлены ўваход — гэта цікавая і рэдкая для Беларусі дэталь. Фрыз вакол будынка ўпрыгожаны паласой дэкаратыўнага жывапісу.

За касцёлам цудам захаваўся самы стары драўляны будынак у Беларусі 1630-х. Збудаваны ён без адзінага цвіка. Яго першае прызначэнне — жытло для манашак-брыгітак. Нядаўна тут было памяшканне бальніцы, дзе вёў прыёмы псіхіятр. Цяпер памяшканне вызваленае.

Наведайце ўнікальны помнік архітэктуры ранняга барока!

**Гарадзенскі блог s13.ru**



# Нічога таемнага

«Калі ў вас няма параноі, яшчэ не значыцца, што за вамі не сочаць».

Паслуга МТС «Сям'я пад наглядам», пра якую «НН» пісала ў папярэднім нумары, працягвае радаваць ахвотнікаў паназіраць за чужым жыццём. Але калі вызначыць, дзе канкрэтна знаходзіцца чалавек, можна легальна, то што можна даведацца незаконна? Бадай што ўсё.

### Юпітэр і быкі

Пасля выбуху 3 ліпеня 2008 года ў інтэрнэце з'явілася інфармацыя, што спецслужбы запатрабавалі ў аператараў мабільнай сувязі Velcom і МТС звесткі пра ўсіх абанентаў, якія прысутнічалі на трагічным канцэрце. Апроч таго, кажуць, забралі двухмесячны архіў размоваў кожнага карыстальніка паслуг аднаго з аператараў. Так, на ўсялякі выпадак.

Варта пахваляваца і ўладальнікам электронных скрыняў на tut.by, mail.by і іншых беларускіх серверах. Супрацоўнікі КДБ маюць права папрасіць у сайтаў перапіску карыстальнікаў.

Але нават шараговы грамадзянін здольны незаконна ажыццявіць тое, што дазволена спецслужбам. Варта падысці да пытання з належнай увагай.

### Паўтарыце, я ж запісваю

Запыт «праслухоўванне тэлефонаў» па-расійску дае 753 тысячы старонак у Google, па-англійску — некалькі мільёнаў. Ёсць попыт — будзе і прапанова. Вось толькі некаторыя са спосабаў — зразумела, што нелегальных.

Калі ўзброіцца спецыяльнай праграмай — каштуе каля $90, — падключыць свой тэлефон да камп'ютара і патэлефанаваць «ахвяры», дастаткова трох хвілін гутаркі, каб праграма перапісала дадзеныя чужой SIM-карты. З таго часу вы — двайнік, які можа праслухоўваць размовы і чытаць смс-паведамленні.

Спецыяльная апаратура дазваляе чуць дыялог, накіроўваўшы моцную антэну ў бок «ахвяры». Зусім як у дэтэктывах. Такую тэхніку не знойдзеш на рынку, дазвол на яе ўвоз у краіну прымаецца на самым высокім узроўні.

### Крымінальнае чытво

Чалавека цікава не толькі слухаць, але і чытаць. Перахопліваць можна ўсё што заўгодна — ад смс і перапіскі ў сацыяльных сетках да мэйлаў.

Аматар чытаць чужыя смс-кі можа скарыстацца тым самым прынцыпам, што і пры падключэнні «Сям'і пад наглядам» ад МТС. Прынцып «дай мабільнік на пару хвілін». За гэты час на тэлефон усталёўваецца праграма. У выніку копія кожнага вашага смс-паведамлення будзе дасылацца на тэлефон чужы.




Сацыяльныя сеткі — настолькі недасканалая з тэхнічнага пункту гледжання рэч, што спрактыкаваны хакер за паўдня даведаецца пароль «замоўленага» чалавека. На камп'ютарных форумах вісяць цэннікі. Прыкладам, зламаць профіль укантакце каштуе каля 100 тысяч рублёў.

Прапановы наконт ўзлому электроннай пошты ці ICQ таксама карыстаюцца папулярнасцю. Пошта на Яндэксе ацэньваецца ў 200 тысяч, на Gmail.com — 300 тысяч.

### Што за гэта будзе?

Канстытуцыя Беларусі гарантуе недатыкальнасць асабістага жыцця. Заканадаўча праслухоўванне забаронена — апроч выпадкаў, калі гэта патрэбна следству.

У Крымінальным кодэксе краіны ёсць артыкул «тайна тэлефонных перамоваў», за парушэнне якога прадугледжаны выпраўленчыя працы, штраф ці арышт. Праўда, часта крымінальны артыкул пераўтвараецца ў адміністрацыйнае «хуліганства».

Украіна ж ідзе ў нагу з тэхнічным прагрэсам. Вярхоўная Рада гэтай краіны нядаўна ўдакладніла — за праслухоўванне чужых тэлефонаў пагражае выключна крымінальная адказнасць. Прычым сесці ў турму можна і за захоўванне апаратуры, і нават за спробу яе нелегальнага ўвозу.

**Ягор Марціновіч**

НАША СТРАВА

## Кампот з апельсінаў

10 апельсінаў, 300 г цукру, 1 шклянка вады

Ачысціць апельсіны, падзяліць на долькі і прыгожа пакласці ў салатнік. Цукар заліць вадой, размяшаць, адставіць, пакуль цукар не распусціцца. Лупіны ад 3—4 апельсінаў ачысціць ад белых слаёў, пакінуўшы толькі жоўтую скурку, заліць вадой і варыць да мяккасці.

Калі цукар цалкам распусціцца, згатаваць цукровы сіроп, дадаць у яго апельсінавыя скуркі, яшчэ раз давесці да кіпення, астудзіць. Халодным сіропам заліць долькі апельсінаў і даць настаяцца некалькі гадзін, каб набралiся сіропам.

Падаваць у якасці дэсерту.

З кнігі: Вінцэнта Завадская, «Кухарка літоўская», 1858

**Рэцэпты тыдня падрыхтавала і праверыла — пальчыкі аблізала — Наталка Бабіна**

ЯКАСЦЬ ЖЫЦЦЯ

# Як выбіраць мандарыны?

Мандарыны родам з Паўднёва-Усходняй Азіі. Першая згадка пра іх сустракаецца ў кітайскім рукапісе 1178 года. А названыя так мандарыны таму, што калісьці былі вельмі дарагімі і даступнымі толькі самым багатым і шляхетным кітайцам — мандарынам. Цяпер гэтую садавіну вырошчваюць у Кітаі, Бразіліі, Італіі, Алжыры, Грэцыі, Марока, на Кіпры.

### Як есці мандарыны

Мандарыны вельмі карысныя. У іх утрымліваецца фаліевая і бэта-каранцінавая кіслоты, калій, магній і кальцый, вітаміны C, P, B1, B2, A, D (прафілактыка рахіту), K (забяспечвае эластычнасць крываносных сасудаў). Мандарыны паляпшаюць апетыт, абменныя працэсы ў арганізме. Іх выкарыстоўваюць як эфектыўны супрацьгрыбковы і супрацьастматычны сродак, пры гіпавітамінозах.

Есці мандарыны варта цалкам: разам з белай сетачкай, якая змяншчае гліказіды — рэчывы, што ўмацоўваюць сасуды. А лупіны ўтрымліваюць эфірныя алеі, арганічныя кіслоты, флаваноіды, якія паляпшаюць выпрацоўку стрававальнага соку і стымулююць засваенне ежы. Свежыя мандарынавыя лупіны выкарыстоўваюцца ад болю ў жываце, пры дыярэі і бранхітах, а высушаныя — супакойваюць нервы і падаўжаюць дзеянне болесуцішальных сродкаў. Адвар з мандарынавых лупінаў дапамагае пры бранхіце і трахеіце.

### Ідэальны — іспанскі

Першая прыкмета таго, што мандарын будзе салодкі, — калі ён здаецца зацяжкім для свайго памеру.

Мандарыны з розных краінаў маюць розны смак. Мараканскія — салодкія і без костачак. На выгляд яны невялікія, ярка-памаранчавыя, з порыстай тонкай лупінай, якая добра счышчаецца.



Турэцкія — жоўта-зеленаватыя, таксама невялікія, з больш гладкай лупінай, якая горай адлушчваецца. Іх смак — з лёгкай кіслінкай. Яны маюць шмат костачак. Затое танныя.

Самыя салодкія і сакавітыя — іспанскія мандарыны. Іх можна пазнаць па буйных памерах, ярка-памаранчавым колеры, тоўстай порыстай лупіне, якая лёгка здымаецца, і невялікай колькасці костачак. Яны звычайна даражэйшыя за іншыя гатункі.

### Сваякі мандарына

Варта пакаштаваць і гібрыды мандарына з іншымі цытрусавымі. Напрыклад, клеменцін — прадукт скрыжавання мандарына з апельсінам-каральком. Гэта яскрава-памаранчавы, хоць дробны, але вельмі салодкі і сакавіты фрукт.

Іншыя сваякі мандарына — танжэла і натсумікан — гібрыды мандарына з грэйпфрутам. На смак яны больш нагадваюць апельсін. Тангора — вынік скрыжавання мандарына з апельсінам, цытрандарын — з дзікай цытрынай (понцырусам), каламандзін — з кумкватам.

Зычу сустрэць навагоднія святы з самымі смачнымі мандарынамі на стале!

**Настасся Шамрэй**

## У Мінску дабудавалі мост па вуліцы Кальварыйскай

Ужо з 10 снежня па ім пусцяць транспарт.

Будаўніцтва аўтамабільнай развязкі па вуліцы Кальварыйская ў Мінску падыходзіць да завяршэння. На мосце праз чыгуначныя шляхі на Маладзечна скончаюцца даробкі.

З 10 снежня па мосце паедзе грамадскі транспарт, які больш за год ішоў у абыход па часовай дарозе. Гэта выклікала штодзённыя заторы ў раёне вуліцы Ціміразева.

**ЯМ**

КАЛЯНДАР

## Снежань

**1** — Дзень абароны ад СНІДу.

**2** — Дзень бульбы. Лічыцца, што ў гэты дзень у Еўропу з Амерыкі была ўпершыню прывезеная бульба.

**10** — Дзень правоў чалавека.

**15** — 75 гадоў (1934) спаўняецца Станіславу Шушкевічу, першаму кіраўніку незалежнай Беларусі.

**15** — 150 гадоў таму (1859) ў Беластоку нарадзіўся Людвік Заменгоф, вынаходнік мовы эсперанта. Пэўны час ён жыў і працаваў у Гродна.

**17** — Дзень беларускага кіно.

**20** — У гэты дзень у 2004 забілі беларускую журналістку Вераніку Чаркасаву.

**20** — Дзень супрацоўнікаў органаў дзяржаўнай бяспекі.

**25** — Божае нараджэнне ў каталікоў, уніятаў, пратэстантаў.

**31** — Шчадрэц. Конадзень Новага года.

**Склаў ЛК**

ГАЗЕТКА ДЗЕТКАМ

Блакіт нябёс, і белы бусел,
І кветкі ў полі, як абрус...
Мой край завецца Беларуссю,
А сам я — хлопчык-беларус.

**Сяржук Сокалаў-Воюш**

Больш вершаў — на dzietki.org

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

КАЛЯНДАР

**Найлепшы падарунак на Новы год** — першы беларускі каляндар «Грунвальд». Пытайцеся ў кнігарнях, на кніжных кірмашах і ў незалежных распаўсюднікаў.

ЖЫТЛО

**Здыму 2-пакаёвую кватэру ў Мінску,** пажадана недалёка ад Інстытута культуры (але разглядаюцца ўсе варыянты). Своечасовая аплата і парадак гарантаваны. Да 250$. Т.: (044) 488-02-32.

ВІТАННІ

**Прывітанне Зайцу Мікалаю** ад сябра Алеся!

ЗАПРАШАЕМ У ПАДАРОЖЖА

**Кракаў–Вялічка** 18–21 снежня. Т.: 292-54-58, (029) 622-57-20, (029) 110-19-28, (029) 509-12-16

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Амбасадарка Францыі Мюрэй Мюсо скончае сваю дыпламатычную місію. Яна развіталася з Беларуссю на ўрачыстасцях, прысвечаных 197-й гадавіне пераправы арміі Напалеона праз Бярэзіну. Беларусь, запэўніла яна, застанецца ў яе памяці як краіна цудоўных людзей.**



**Кавярні змагаюцца за месца пад сонцам. Сушы з голага цела елі наведнікі мінскага «Монкафэ» 26 лістапада. Наведнікам прапанавалі есці стравы з аголеных целаў — жаночага і мужчынскага. Каб гэта не выглядала чыстай распустай або чыстай рэкламай, рэстаратары ўзгадалі, што гэта — старадаўняя японская традыцыя падавання сушы з цела жанчыны і мужчыны. Па-японску яна называецца «ніётаморы».**

**Святло навукі. Такія кнігі прапаноўваюцца ў кнігарнях Брэста (знізу).**







## АНЕКДОТЫ

* * *

Аўстралійскі фермер падышоў да сажалкі і ўбачыў, што ў ёй купаюцца голыя дзяўчаты. Тыя яго заўважылі і загарлапанілі:

— Валі адгэтуль, мы не выйдзем з вады, пакуль ты не сыдзеш!

Фермер:

— Трэба вы мне. Я толькі хацеў пакарміць свайго кракадзіла.

* * *

Па інфармацыі міліцыі, мінулай ноччу ў заапарку два з паловай невядомых спрабавалі скрасці льва...

* * *

SMS: ты забыўся свой мабільнік у мяне!

* * *

Муж вяртаецца раніцай дахаты. З кішэні паліто звісае бюстгальтар.

— Ах ты нягоднік! Гэта што?! — трапянее жонка.

— Як — што? Падвойная маска ад грыпу. Самая апошняя мадэль. Усю ноч па аптэках шукаў...

* * *

Калі чалавек набыў сабе «бэнтлі», гэта яшчэ не значыць, што ён багаты. Можа, ён эканоміў тры месяцы...

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

Да капелюшоў усіх кабет Еўропы ужываюць пёраў ад 300 мільёнаў пташак у год.

**НН. 1909. №49**

Нядаўна на ОРТ паказалі аўтарскую версію карціны «Мяне завуць Арлекіна» беларускага рэжысёра Валерыя Рыбарава. За гэта рэжысёр атрымаў ганарар у памеры 54-х расійскіх рублёў (каля 2 даляраў). Два новыя фільмы, якія Рыбараў ужо пачаў здымаць на «Беларусьфільме», былі закрытыя: «Голас крыві брата твайго» (паводле Адамчыка) і «У пошуках бацькі». Беларускі кінематограф пастаўлены ў такія ўмовы, у якіх нацыянальныя матывы хутка звядуцца да скокаў Лявоніхі, вышытых кашуляў і кабетаў з паставамі балерыны ў нацыянальным адзенні, праз якое прасвечвае нейлонавая бялізна — як гэта было ў «Людзях на балоце», калі ад Мележа пакінулі толькі «шкілет».

**НН. 1999. №33**

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

©**НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6180. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 01.12.2009.
Замова № 6612.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9 771819 161008 09045